Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 МАЯ 2017 г. СУБОТА № 89 (28453)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## СІМВАЛЫ ЯДНАННЯ

***Дарагія суайчыннікі!***

Сардэчна віншую вас з Днём Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь.

Гэтыя сімвалы аб'ядноўваюць грамадзян нашай суверэннай краіны, натхняюць іх на вялікія здзяйсненні, беззапаветнае служэнне Айчыне.

Кожны з нас павінен разумець: вернасць Радзіме пачынаецца з павагі да нацыянальнай сімволікі і гераічнай гісторыі.

Беларусь адбылася як незалежная дзяржава, якая адстойвае ідэі міру і сацыяльнай справядлівасці. Яна паспяхова развіваецца, расце яе міжнародны аўтарытэт. У гэтым велізарная заслуга нашага працавітага і мужнага народа, які ўпэўнена стварае сваю будучыню.

Ад усёй душы жадаю вам святочнага настрою, дабрабыту, поспехаў у працы дзеля працвітання роднай зямлі.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый СЯНЬКО, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта:**

*«У першым квартале 2017 года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2016-га аб'ём увезеных праз мытную мяжу ЕАЭС у Рэспубліку Беларусь транзітных тавараў павялічыўся на 18%. Гэты факт сведчыць аб паляпшэнні транзітнай прывабнасці краіны і стварэнні спрыяльных умоў для перасячэння мытнай мяжы Еўразійскага эканамічнага саюза».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.05.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8733 | ▲ |
| Еўра | 2,0347 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0707 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# 55 адценняў ізумруднага



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Леанід і Лілія ЯШЧУКІ — 55 гадоў у шлюбе пасля двух тыдняў знаёмства.

СТАР. 3

■ Добрая навіна

# АД «ХАЛОПА»-ЖУКА ДА «АКУЛЯРАЎ У МІНУЛАЕ»

### Талачынскі гісторыка-краязнаўчы музей выйграў грант Прадстаўніцтва ААН у Беларусі

**На атрыманыя грошы плануецца стварыць інтэрактыўную музейную прастору. Напрыклад, у зале прыроды пры выкарыстанні спецыяльных акуляраў можна будзе апынуцца ў лесе. І ўбачыць, як тэхнагенныя аварыі ўплываюць на навакольле. Акуляры віртуальнай рэальнасці ў этнаграфічнай зале дапамогуць пагрузіцца ў нарыхтоўку зёлак, ільну... Наведвальнікам паралельна растлумачаць, што такое этнабатаніка і этнабіялогія. Для арганізацыі экскурсій тут будуць выкарыстоўваць інфакіёскі і вялікія маніторы. У сценах музея стане зручна праводзіць семінары і майстар-класы. Усё гэта дазволіць павялічыць колькасць наведвальнікаў. Пакуль што тут прадаюць каля 4 тысяч квіткоў у год.**



Будынак музея ў Талачыне.

**Адчуць Сярэднявечча**

Музей у Талачыне адкрылі ў 2001-м, у год святкавання 1000-годдзя Друцка. Ён месціцца ў доме, пабудаваным у канцы пазамінулага стагоддзя. Дакладна невядома, што тут было да рэвалюцыі 1917-га. Па адной з версій, у будынку жыў уласнік завода, па іншай — знаходзіўся зямельны банк. Цяпер у асноўным фондзе музея больш за 10 тысяч прадметаў, акрамя таго, гэта ўстанова культуры валодае адной з самых багатых на Віцебшчыне калекцый археалагічных артэфактаў.

СТАР. 5

# ПЯЦЬ ЖЫЦЦЯЎ СТАДЫЁНА «ДЫНАМА»

### Якім ён быў і якім стане

**Самы вялікі стадыён краіны, які бачыў так шмат бітваў, перамог і слёз, зараз падобны на раскіданае гняздо. Літаральна праз месяц яму споўніцца 83 гады, а свой наступны дзень нараджэння ён павінен адсвяткаваць ужо ў новым абліччы, бо ў 2019-м «Дынама» будзе прымаць Еўрапейскія гульні. Гэта стане адной з самых важных падзей для спартыўнага аб'екта з вялікай гісторыяй. Галоўныя вехі жыцця стадыёна ўспамінаем за 9 месяцаў да меркаванага заканчэння рэканструкцыі.**

СТАР. 13



# КАДРЫ — НОВЫЯ, ПАТРАБАВАННІ — ТЫЯ Ж

## Прэзідэнт зрабіў шэраг новых назначэнняў

***Кіраўнік дзяржавы назначыў:***

ШУЛЕЙКУ Юрыя Вітольдавіча — памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектарам па Гомельскай вобласці;

АСТРЭЙКУ Аляксандра Вячаслававіча — начальнікам упраўлення ўнутраных спраў Брэсцкага аблвыканкама;

КУБРАКОВА Івана Уладзіміравіча — начальнікам упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама;

МІРОНАВА Максіма Аляксандравіча — начальнікам дэпартамента забеспячэння аператыўна-вышуковай дзейнасці;

ЭЙСМАНТА Івана Міхайлавіча — намеснікам старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь.

***Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:***

ПЯНЬКОЎСКАГА Леаніда Канстанцінавіча — старшынёй Аршанскага райвыканкама;

ЧЭПІКА Сяргея Васільевіча — старшынёй Пастаўскага райвыканкама;

БЫКАВА Уладзіміра Уладзіміравіча — старшынёй Расонскага райвыканкама;

АЎДОШКІ Уладзіміра Генадзевіча — старшынёй Ушацкага райвыканкама;

ПЛЯШКО Леаніда Уладзіміравіча — старшынёй Чашніцкага райвыканкама;

ЛАМАКІ Дзмітрыя Міхайлавіча — старшынёй Шаркаўшчынскага райвыканкама;

БАНДАРЭНКІ Анатоля Уладзіміравіча — старшынёй Хойніцкага райвыканкама;

СТУДНЕВА Аляксандра Віктаравіча — старшынёй Бабруйскага гарвыканкама;

РЭПКІНА Сяргея Барысавіча — рэктарам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры»;

ВЕЖНАЎЦА Івана Валер'евіча — намеснікам міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю;

ПАЎЛЮЧЭНКА Наталлі Віктараўны — кіраўніком Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны;

СІЗІНА Сяргея Фёдаравіча — намеснікам начальніка Беларускай чыгункі;

БУСЬКО Віталя Леанідавіча — дырэктарам арганізацыйнага дэпартамента Выканаўчага камітэта Садружнасці Незалежных Дзяржаў;

НЯВЕРАВА Аляксея Мікалаевіча — членам Гомельскага аблвыканкама;

ГУРЫНОВІЧА Уладзіміра Аляксандравіча — кіраўніком спраў Мінскага аблвыканкама;

ШЫШКАНАВА Максіма Міхайлавіча — членам Мінскага аблвыканкама.

**Назначаючы новае кіраўніцтва ў некаторыя мясцовыя органы краіны, Прэзідэнт асаблівую ўвагу ўдзяліў пасяўной кампаніі, якая сёлета з-за незвычайных умоў надвор'я зацягнулася.**

### Пра надзённае

— Якая сітуацыя зараз у сувязі з умовамі надвор'я ў Віцебскай вобласці, — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы, — дапусцім, у Паставах?

Аляксандр Лукашэнка таксама турбаваўся, якую шкоду нанеслі снегапады пасевам:

— Мяне хвалюе, каб умовы надвор'я не нанеслі шкоды. Я ўсё-такі больш схільны да таго, што ў прыродзе ўсё ўраўнаважана: сёння заліло, заўтра засушыць. Безумоўна, трэба аператыўна пасеяць, але не ва ўрон якасці. Гэта датычыцца перш за ўсё Віцебскага рэгіёна — у Хойніках, відаць, ужо амаль усё пасеяна. Трэба аператыўна скончыць гэты сеў, але галоўнае, не трэба мучыць людзей і самім мучыцца.

Так, па словах кіраўніка дзяржавы, трэба правільна выкарыстоўваць сельскагаспадарчы патэнцыял кожнага рэгіёна, у прыватнасці, гэта датычыцца Віцебскай вобласці.

— Нам трэба мяняць севазварот. Калі ў нас ёсць раёны ў Віцебскай вобласці, дзе можна ў вялікіх аб'ёмах апрацоўваць збожжавыя культуры, то там трэба апрацоўваць збожжавыя. Таму што ў вобласці ўсё роўна павінны быць збожжавыя. У астатніх раёнах у кожнай гаспадарцы выбіраць толькі асобныя палі для таго, каб вырабіць камбікормы для буйной рагатай жывёлы. Усё астатняе трэба аддаваць пад травы і вырабляць малако. Вы спецыялісты, глядзіце самі. Не чакайце, што нехта да вас прыедзе і падкажа. Проста трэба пераходзіць на гэтыя тэхналогіі для таго, каб вырабляць больш кармоў, падкрэсліў Прэзідэнт.

Яшчэ адно даручэнне датычыцца ўкаранення сучасных тэхналогій для захоўвання кармоў — асабліва сенажу і сіласу.

### Тры «кіты» сацыялкі

Нагадаў Аляксандр Лукашэнка і пра вырашэнне традыцыйных пытанняў:

— Асноўныя пытанні, пра якія мы ўвесь час гаворым, — гэта пытанні сацыяльныя, якія, як ні дзіўна, пацягнуць за сабой эканоміку: цэны, зарплата, занятасць. Вырашаючы гэтыя пытанні, мы нікуды не дзенемся ад мадэрнізацыі прадпрыемстваў, ад стварэння новых працоўных месцаў — нам прыйдзецца іх ствараць. Ну і, адпаведна, заработная плата. Калі мы сёлета не вырашым праблему з узроўнем заработнай платы, нам будзе немагчыма працаваць у будучыні. Нас людзі ўвогуле не зразумеюць.

Каб дабіцца больш высокай зарплаты, Прэзідэнт параіў мясцовым уладам «ушчыльняцца, скарачацца, эканоміць».

### Даць другое дыханне

Падчас размовы з назначэнцамі Аляксандр Лукашэнка асаблівую ўвагу ўдзяліў Бабруйску (там назначаны новы старшыня гарвыканкама) і Оршы (там — новы кіраўнік райвыканкама). Прэзідэнт ужо раней агучваў даручэнні па развіцці Аршаншчыны, ён збіраецца наведаць гэты рэгіён, калі там будзе выпрацаваны план мадэрнізацыі.

— Гэтыя рэгіёны — чарговая, можна сказаць, эпапея, якую мы пачынаем. І мы павінны вельмі хутка вырашыць гэтыя праблемы. Бо Мінск — быццам жыць можна, парадак навялі, людзі працуюць, патроху паднімаецца вытворчасць... Абласныя цэнтры — зразумела. А што далей?.. Раённыя цэнтры больш-менш у парадак прывялі, а вось гэтыя буйныя гарады і рэгіёны вакол іх — тут у нас ёсць праблемы. У Оршы вялікая праблема па беспрацоўі. Зразумела, што там і турма, і людзі вызваляюцца, не ўсе з'язджаюць... Іх абавязкова трэба задзейнічаць. Інакш мы атрымаем рэцыдывы — пасля вызвалення з месцаў зняволення.

У Бабруйску, па словах Прэзідэнта, сітуацыя трошкі лепшая, тым не менш і там неабходна навесці парадак:

— Размовы скончылі, ніхто нікога слухаць не будзе, і спасылак на тое, што нечага там не хапіла, быць не павінна. Вы сёння выходзіце і ад імя Прэзідэнта здзяйсняеце тую палітыку, пра якую я так шмат кажу і многія людзі кажуць. Вы ведаеце, што там трэба рабіць.

### Ідэалогія — праз спорт

Агучыў Аляксандр Лукашэнка свае патрабаванні і наконт ідэалогіі.

— У нас усе чамусьці лічаць, што ідэалогія — гэта прыйшоў, лекцыю прачытаў... Нават не думаюць, які эфект ад гэтага. Самая вялікая ідэалогія — гэта там, дзе паднімаецца дух людзей. Дух народа. Я зараз маю на ўвазе не звычайныя масавыя мерапрыемствы, а спартыўныя.

Так, у многіх гарадах пабудаваны культурна-спартыўныя комплексы, лядовыя палацы — у тым ліку і ў Оршы, Бабруйску. Але спартыўных камандаў, на жаль, няма.

— У нас вызваліся добрыя рабяты, яны гатовы паехаць працаваць трэнерамі. Трэба гэтых рабят запрашаць, трэба іх забяспечыць жыллём і стварыць каманду. Там, дзе ёсць каткі, трэба ствараць школу і каманду: асноўная каманда, дублюючы склад... Гэтыя аб'екты не павінны пуставаць. Няхай дзесяцікласнікі, адзінаццацікласнікі будуць занятыя на гэтых мерапрыемствах — гэта ж адпаведны дух, гэта аб'ядноўвае людзей. Менш будуць хадзіць на плошчы. Вы паглядзіце, што ў Расіі робіцца! Дзесяцікласнікі, адзінаццацікласнікі, студэнты вывалілі на вуліцы.

З дзецьмі, падлеткамі, на думку кіраўніка дзяржавы, трэба ў гэтым плане працаваць — і не толькі размаўляць, але і далучаць іх да ўдзелу ў розных спартыўных мерапрыемствах.

Што датычыцца тэмы адукацыі, то Аляксандр Лукашэнка заявіў: трэба мяняць графік работы школ.

— Раней за дзевяць гадзін урокі пачынаць не трэба, — упэўнены ён. — Няхай бацькі думаюць...

Так, многія школьнікі з-за таго, што ў школу трэба паднімацца вельмі рана, дрэнна засвойваюць матэрыял на першых уроках. Ды і фізічна прачнуцца ў шэсць раніцы для большасці складана.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### НАТА цалкам залежыць ад ЗША

Прэзідэнт Фінляндыі Саўлі Нійнісцё адзначыў, што паўночнаатлантычны альянс не з'яўляецца еўрапейскай арганізацыяй.

Такую думку ён выказаў у апублікаваным інтэрв'ю нямецкай газеце Frankfurter Allgemeine Zeitung.

«Не хачу сказаць што-небудзь супраць НАТА, але нават калі амерыканскі прэзідэнт Дональд Трамп змякчыў сваю крытыку ў адносінах да яе, атлантычны альянс не з'яўляецца еўрапейскай арганізацыяй. НАТА цалкам залежыць ад Амерыкі», — падкрэсліў Нійнісцё.

Прэзідэнт Фінляндыі выказаў меркаванне, што ЕС павінен гарантаваць бяспеку грамадзян, якія ў яго ўваходзяць. «Уласна кажучы бяспека вышэй росквіту, — сказаў ён. — На працягу многіх гадоў мы лічылі, што не павінны пра гэта турбавацца, але цяпер сітуацыя змянілася. Я думаю, што калі б Брусель змог паабяцаць грамадзянам гарантыі бяспекі, гэта было б нашмат папулярней».

### КНДР пагражае ЗША «жорсткімі контрмерамі» за палітыку «дзяржаўнага тэрарызму»



Палітыка «дзяржаўнага тэрарызму», якую праводзіць Вашынгтон у дачыненні да КНДР, «абернецца для ЗША катастрафічнымі наступствамі». Пра гэта гаворыцца ў мемарандуме інфармацыйнага агенцтва ЦТАК.

Інфармагенцтва крытыкуе адміністрацыю прэзідэнта ЗША Дональда Трампа, якая паставіла мэту «максімальна ўзмацніць палітычны, эканамічны і ваенны ціск на Пхеньян, дамагаючыся ліквідацыі вышэйшага кіраўніцтва КНДР і змены рэжыму». Згодна з дакументам, у КНДР выклікала хваляю абурэння нядаўняя сакрэтная аперацыя спецслужбаў ЗША і Паўднёвай Карэі, накіраваная супраць вышэйшага кіраўніцтва рэспублікі. Пра тое, што гэтую «злачынную акцыю» ўдалося сарваць, 5 мая паведаміў прадстаўнік Міністэрства дзяржаўнай бяспекі КНДР.

У такой сітуацыі, адзначаецца ў мемарандуме, армія і народ КНДР «прымуць самыя жорсткія контрмеры з мэтай самаабароны». На думку ЦТАК, праведзеныя ў красавіку ў КНДР маштабныя ваенныя манёўры прадэманстравалі «здольнасць Карэйскай народнай арміі правесці спецаперацыю ў выпадку ўзнікнення надзвычайнай сітуацыі, каб сарваць тэрарыстычную вылазку варожых сіл».

### Суд у Лондане абавязаў расіяніна выплаціць жонцы 586 млн долараў

Высокі суд Лондана абавязаў расійскага мільярдэра выплаціць былой жонцы 453 млн фунтаў стэрлінгаў (586 млн долараў).

Гэта адна з самых высокіх кампенсацый па выніках шлюбаразводнага працэсу, якія калі-небудзь праходзілі ў судзе Злучанага Каралеўства. Імёны экс-мужа і жонкі не раскрываюцца. Вядома, што расійскаму прадпрымальніку 61 год, ён ураджэнец Каўказа, былы гандляр нафтай і газам. Яго былой жонцы 41 год, яна нарадзілася ва Усходняй Еўропе, пасля вяселля займалася хатняй гаспадаркай. Падчас слуханняў суддзя паведаміў, што пара пазнаёмілася і зарэгістравала шлюб у Маскве, а пазней пераехала ў Брытанію, у графства Сурэй.

■ Супрацоўніцтва

## «БЕЛДЖЫ» ПРАДСТАВІЦЬ ТРЫ НОВЫЯ МАДЭЛІ АЎТАМАБІЛЯЎ

### Гэта адбудзецца на XX Беларускім прамысловым форуме

**Акрамя аўтамабіляў "БелДжы", на выстаўцы ўпершыню пакажуць розную тэхніку: аўтобус МАЗ, аўтамабіль-офіс маркі «Купава», трактарны завод пакажа ўзоры новых трактароў, а «Амкадор» прывязе новы пагрузчык. Таксама на стэндах з'явяцца трансфарматары, ультрагукавыя лічыльнікі газу і многае іншае, — аб гэтым расказаў начальнік галоўнага ўпраўлення інавацыйнай і інвестыцыйнай дзейнасці Міністэрства прамысловасці Валерый ФІШМАН на прэс-канферэнцыі напярэдадні прамысловага форуму.**

За доўгія гады Беларускі прамысловы форум набыў статус міждзяржаўнага мерапрыемства: на юбілейнай выстаўцы, акрамя айчынных прадпрыемстваў, найноўшыя распрацоўкі пакажуць арганізацыі Кітайскай Народнай Рэспублікі, Славацкай Рэспублікі, Разанскай, Самарскай, Калужскай абласцей і Рэспублікі Татарстан Расійскай Федэрацыі.

— Сёлета ў выставачных мерапрыемствах Беларускага прамысловага форуму прымуць удзел больш за 250 прадпрыемстваў, — адзначыў **дырэктар унітарнага прадпрыемства «Экспафорум» Аляксандр СТАРЫКАЎ.** — Акрамя таго, у традыцыйным конкурсе зваршчыкаў прыме ўдзел 161 спецыяліст з 89 прадпрыемстваў.

На пляцоўцы Беларускага прамысловага форуму адначасова будуць працаваць тры буйныя спецыялізаваныя выстаўкі: ТэхІнаПрам — тэхналогіі і інавацыі ў прамысловасці, выстаўка-прэзентацыя «Прафзварка» і «ПЛАСТЭХ». «Трэба адзначыць, што ўпершыню адкрыецца выстаўка палімерных матэрыялаў, тэхналогій і прыкладнога выкарыстання «ПЛАСТЭХ». На ёй прадставяць сыравіну і матэрыялы, а таксама тэхналогіі і дзеючае абсталяванне для вытворчасці і перапрацоўкі палімераў», — дадаў Аляксандр Старыкаў.

Традыцыйным удзельнікам выстаўкі з'яўляецца Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях. «Мы будзем рабіць дзве новыя пляцоўкі, — сказаў **першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Андрэй КАСОЎСКІ.** — Першая — калектыўны стэнд на 200 квадратных метраў і больш за 200 навукова-тэхнічных распрацовак. Другая — гэта форум бізнес-ідэй, каб сабраць разам навукоўцаў і інаватараў».

Беларускі прамысловы форум пройдзе ў Мінску з 23 па 26 мая на найбуйнейшай выставачнай пляцоўцы краіны — у Футбольным манежы.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by* ■

# СЯМ'Я РОБІЦЬ НАС МАЦНЕЙШЫМІ,

## а дзяржава думае, як зрабіць мацнейшай сям'ю

**15 мая Беларусь разам з іншымі краінамі будзе адзначаць Міжнародны дзень сям'і. У 2017 годзе ва ўсім свеце гэты дзень пройдзе пад дэвізам «Сям'я, адукацыя і дабрабыт». Гэта значыць, што ў цэнтры ўвагі дзяржавы — пытанні адукацыі і забеспячэння дабрабыту сем'яў.**

### Сацыяльная абарона сем'яў з дзецьмі-інвалідамі будзе павышана

Паводле даных перапісу насельніцтва, у нашай краіне зараз пражываюць каля 2,7 млн сем'яў, амаль 45% з іх маюць дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў. Усяго дзяцей да 18 гадоў у рэспубліцы — 2785,4 тысячы.

— Для таго каб сям'я была паўнавартаснай, у ёй павінна быць як мінімум двое дзяцей, — лічыць **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК.** Менавіта сем'і з дзецьмі, на думку Аляксандра Румака, складаюць аснову дабрабыту і ўстойлівага развіцця любой дзяржавы.

У нашай краіне, па словах намесніка міністра, падтрымка сем'яў з'яўляецца дзяржаўным прыярытэтам. Сем'і з дзецьмі могуць прэтэндаваць на 11 відаў дзяржаўных дапамог. На сённяшні дзень гэтыя дапамогі выплачваюцца на 558 тыс. дзяцей, або 30,6% ад іх агульнай колькасці. Гэта значыць, што амаль кожнае трэццяе дзіця атрымлівае той ці іншы від дзяржаўнай дапамогі. Пры гэтым дзяржаўнымі дапамогамі забяспечаны практычна 100% дзяцей ва ўзросце да трох гадоў.

У найбліжэйшы час плануецца далейшае ўзмацненне дзяржпадтрымкі сем'яў з дзецьмі-інвалідамі. Так, паводле слоў Аляксандра Румака, у закон «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» плануецца ўнесці шэраг мер па ўзмацненні сацыяльнай абароны сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, а таксама сем'яў, у якіх самі бацькі з'яўляюцца інвалідамі.

Так, сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў з найбольш цяжкімі формамі інваліднасці (3—4-я ступені страты здароўя), павялічаць дапамогу са 100% бюджэту пражытачнага мінімуму да 120%. Акрамя таго, бацькам дзіцяці-інваліда будзе нададзена права на дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда незалежна ад выгляду пенсіі, якую яны атрымліваюць (у цяперашні час дапамога выплачваецца толькі бацькам, якія самі з'яўляюцца інвалідамі; тым бацькам, якія атрымліваюць пенсію па ўзросце, яна не выплачваецца).

**На 1 мая гэтага года ў Беларусбанку адкрыта 36 119 дэпазітных рахункаў «Сямейны капітал» на агульную суму большую за 361 млн долараў, у тым ліку ў 2017 годзе ўжо адкрыта 5554 дэпазітныя рахункі на 55,5 млн долараў.**

Яшчэ адна істотная навацыя — наданне бацькам дзяцей-інвалідаў права працаваць на ўмовах няпоўнай занятасці (на паўстаўкі) і адначасова атрымліваць дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда.

### 66,2% беларусаў — за ўвядзенне абавязковага бацькаўскага водпуску

Адна з тэндэнцый у галіне сямейнай палітыкі, характэрная для нашай краіны ў апошні час, — стымуляванне бацькі да адказнага бацькоўства. Гэта азначае як мага большае прыцягненне бацькі да выхавання дзяцей, да выбудоўвання ім адносін з дзецьмі з ранняга ўзросту, інтэлектуальнага і эмацыянальнага кантакту з імі. З гэтай мэтай цяпер прапрацоўваецца пытанне аб атрыманні абавязковага сацыяльнага водпуску бацькам пры нараджэнні дзіцяці. Створана міжведамасная рабочая група, у склад якой, акрамя заканадаўцаў, увайшлі навуковыя супрацоўнікі, прадстаўнікі аб'яднанняў наймальнікаў і прафсаюзаў, міністэрстваў адукацыі і аховы здароўя. Узначальвае працоўную групу Аляксандр Румак. Чарговае пасяджэнне рабочай групы, паводле яго слоў, адбудзецца ў канцы гэтага месяца.

Дарэчы, паводле даных сацыяльнага апытання, 66,2% жыхароў Беларусі выступаюць за ўвядзенне абавязковага бацькаўскага водпуску. Так, за ўвядзенне такога водпуску выказаліся 61,2% рэспандэнтаў-мужчын. Жанчын, якія выступілі з падтрымкай гэтай ініцыятывы, аказалася яшчэ больш — 70,3%. У апытанні, якое было праведзена сёлета ў красавіку-маі Цэнтрам сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ па заказе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, прынялі ўдзел 1000 рэспандэнтаў, якія пражываюць у 78 гарадах і вёсках нашай краіны.

Аляксандр Румак таксама адзначыў, што, паводле даных сацыяльнага апытання, 56,1% рэспандэнтаў лічаць, што бацькі недастаткова часу ўдзяляюць выхаванню і развіццю сваіх дзяцей. У прыватнасці, так лічаць 44,1% апытаных мужчын і 65,9% жанчын. На пытанне «Ці неабходна на дзяржаўным узроўні прымаць меры для ўключэння бацькі ў працэс догляду дзяцей, іх выхаванне і развіццё?» сцвярджальна адказалі 52,4% рэспандэнтаў.

Таксама ў нашай краіне прапрацоўваецца пытанне аб устанаўленні Дня бацькі. Што датычыцца вынікаў сацапытання, то за ўстанаўленне такога свята выказаліся 43,7% рэспандэнтаў. «Мы вывучым меркаванне дзяржаўных органаў аб мэтазгоднасці ўвядзення такога дня», — паведаміў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны.

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

# 55 АДЦЕННЯЎ ІЗУМРУДНАГА

**Ізумруднае вяселле, імянарачэнне немаўляці і рэгістрацыя маладых. Адразу тры святочныя мерапрыемствы і тры моцныя, прыгожыя і яскравыя пары ўпрыгожылі акцыю «Сям'я, як радзіма, павінна быць у кожнага», якую Міністэрства юстыцыі арганізавала напярэдадні Дня сям'і ў канцэртнай зале «Верхні горад».**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.
Навaспечаная сям'я Таццяны і Сяргея ПАЎЛОВІЧАЎ.

Рэгістраваць шлюбы ў апошнія гады маладыя ўсё больш любяць каля помнікаў архітэктуры, у гістарычных мясцінах і замках. У год свайго векавога юбілею органы загса Беларусі арыентаваны на тое, што любое жаданне асоб, якія хочуць зрабіць гэты дзень асаблівым, — закон. Наўрад ці знойдуцца зараз такія ідэі, фантазіі ці жаданні, якія яны не змаглі б увасобіць, заўважыў **Сяргей ЗАДЗІРАН, першы намеснік міністра юстыцыі Беларусі.**

— Орган запісу актаў грамадзянскага стану — гэта першыя дзверы, куды людзі ідуць спачатку як закаханыя, пасля — як шчаслівыя бацькі, каб зарэгістраваць свайго першынца. Так што, па сутнасці, гэта дзверы ў новы свет сямейнашлюбных адносін, — дадаў ён.

Таццяна і Сяргей Паўловічы, якія на вачах гасцей і журналістаў учора сталі новай сям'ёй, пазнаёміліся год назад. З моманту сустрэчы каханых да шлюбу прайшло крыху больш за год. Планавалі пажаніцца менавіта 12 мая ў Маскоўскім загсе. Калі ім прапанавалі паўдзельнічаць у акцыі, пагадзіліся.


Дружнае сямейства ВОЛГІНЫХ.

Якім бы рамантычным ні было каханне само па сабе, але веліч і прыгажосць шлюбу надаюць менавіта дзеці. Наталля Філімонава, начальнік аддзела загса Маскоўскага раёна Мінска, правяла цырымонію імянарачэння маленькага хлопчыка, які нарадзіўся 18 красавіка ў сям'і Волгіных. Дзмітрый Ягоравіч Волгін, трэцяе дзіця ў сям'і шчаслівых бацькоў, атрымаў свой першы дакумент — пасведчанне аб нараджэнні і «з'явіўся на свеце» афіцыйна.

Ізумруднае вяселле (55 гадоў у шлюбе) сёлета адзначаюць муж і жонка Яшчукі, і абодва кажуць, што галоўнае ў шчаслівых адносінах — гэта цярпенне. А да дэвізу акцыі ім хацелася бы дадаць, што «сям'я, як і радзіма, павінна быць у кожнага адна».

— Я сустрэў яе 24 лістапада 1962 года, і праз два тыдні мы сталі мужам і жонкай. І па сённяшні дзень жывём у згодзе і сяброўстве, — падзяліўся Леанід Сцяпанавіч. — Нас у загсе Кастрычніцкага раёна Мінска распісалі ў той жа дзень, як мы падалі дакументы.

— Умець любіць, паважаць, дамаўляцца і быць добрымі да ўсіх і заўжды, — так бачыць рэцэпт доўгага сямейнага шчасця Лілія Міхайлаўна.

Залатое вяселле Леанід Сцяпанавіч і Лілія Міхайлаўна Яшчукі таксама адзначалі ў загсе. Думаецца, гэтая светлая пара пройдзе разам па жыцці яшчэ не адзін год. Зрэшты, як і астатнія закаханыя гэтага свята.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «Чым языком лапатаць — лепш газету пачытаць»

**Аліна і Іосіф ГАВАНОЎСКІЯ, жыхары г. Астравец:**



77-гадовая Аліна Міхайлаўна і 80-гадовы Іосіф Станіслававіч — нашы падпісчыкі з 23-гадовым стажам, якія не толькі чытаюць газету, але і карыстаюцца парадамі, змешчанымі на яе старонках.

— «Звязду» ўпершыню купіў у кіёску выпадкова. Пачытаў, ды так захапіўся, што з наступнага месяца адразу пачаў выпісваць. І вось хутка ўжо чвэрць стагоддзя мы разам з ёй», — успамінае Іосіф Станіслававіч. — Мы заўжды шмат газет выпісвалі, пасля перасталі, а са «Звяздой» засталіся.

— Газета вялікая і карысная, і піша шмат пра што. Я гараскоп заўжды гляджу і праграму тэлебачання, крымінальныя навіны абавязкова чытаю, хоць страшна, што робіцца ў свеце. Вось і сёння прыйшоў прыгожы нумар. Са старонкай «Алё! Народ на провадзе». Вельмі гэтую паласку чытаць любім, — далучаецца Аліна Станіславаўна, гартаючы нумар. — І пра надвор'е можна даведацца, ды не толькі на заўтра, а на тыдзень наперад Куркач з Рабавым расказваюць, чаго чакаць. А малюнкі якія прыгожыя пад прагнозам друкуеце! А «Крынічка» з яе парадамі, калі што саджаць, чым удабраць, вельмі карысная. Я як прачытала, што пад парэчкі лупінне ад бульбы кідаць трэба, каб ураджай лепшы быў, дык нарыхтоўваць іх пачала.

— Вельмі падабаецца, што апавяданні друкуеце, яны жыццёвыя, зразумелыя, блізкія. Трэба пабольш іх, — падае голас Іосіф Станіслававіч. — А Алена Ляўковіч як захаплялна ў сваёй рубрыцы «Неасабісты суб'ектыў» піша! Трапна ды па справе разважае. Ды і ўвогуле выданне харошае, мне ў ім амаль усё падабаецца.

— Газету абое чытаем, у асноўным вечарамі, бо днём жа па гаспадарцы тупаеш. А ўвечары, чым дзе языком лапатаць, дык лепш газету пачытаць. А мне чытаць на беларускай мове падабаецца, бо я добра яе ведаю, — кажа Аліна Станіславаўна. — Я пра «Звязду» ўсім гавару. І сястры рэкамендавала, расказала, што дужа добрыя прызы ў вас можна выйграць. Дык яна ўжо два гады як выпісвае.

— Газета — гэта сябра. Я магу чытаць да позняй ночы. Жонка часам нават злавацьуж ужо пачынае, што святло палю, — жартуе Іосіф Станіслававіч.

Падшыўку «Звязды» Гаваноўскія захоўваюць. Кажуць, выкідаць шкада, хоць і назбіралася ўжо шмат. Асабліва шануюць памятны нумар 10-гадовай даўніны, у якім фота Аліны Станіславаўны з падоранай звяздоўцамі фірменнай майкай.

■ Тэма дня

# ДЭМАГРАФІЯ І СУЧАСНЫЯ ВЫКЛІКІ

**Дэмаграфічныя праблемы ва ўсім свеце становяцца ўсё больш вострымі, і важным становіцца іх абмеркаванне ў тым ліку на маладзёжнай платформе. Такой пляцоўкай у Мінску ўжо чацвёрты раз выступае геаграфічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Студэнты розных краін атрымалі ўнікальную магчымасць абмеркаваць пытанні міграцыі і дэмаграфічных працэсаў, выказаць свае думкі адносна магчымага развіцця падзей у гэтым кірунку.**

Канферэнцыя «Дэмаграфічныя рызыкі XXI стагоддзя» была арганізавана ў межах праекта «Падтрымка рэалізацыі нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь». Фінансуецца праект урадам Расійскай Федэрацыі, Фондам ААН у галіне народанасельніцтва і ЮНІСЕФ. Удзельнікамі сталі дакладчыкі вядучых універсітэтаў Беларусі, Расіі, Украіны, Чэхіі і Казахстана.

«Большая частка тэндэнцый у нашай краіне сугучная агульнаеўрапейскім трэндам, хоць ёсць у нас і некаторыя асаблівасці, — кажа **загадчыца кафедры эканамічнай геаграфіі замежных краін БДУ, доктар геаграфічных навук, прафесар Кацярына АНЦІПАВА.** — Наша краіна старэе, як і большасць краін Еўропы, у нас назіраюцца натуральныя страты насельніцтва, хоць яны і мінімальныя. Крыху вышэйшы за еўрапейскі ўзровень смяротнасці. А станоўчай тэндэнцыяй стала ў апошнія гады — і ў нас, і ў Расіі — павышэнне нараджальнасці. Гэта звязана з уступленнем у дзетародны ўзрост апошняга шматлікага пакалення, за якім нам варта чакаць дэмаграфічнай ямы. Другі момант, які паспрыяў нараджальнасці, — наша сістэма дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, хоць, на думку замежных экспертаў, гэта слаба ўплывае на нараджальнасць». Сучасным выклікам становіцца дэмаграфічнае старэнне насельніцтва, якое цягне за сабой не проста рост долі пажылога насельніцтва, а дэфіцыт працоўных рэсурсаў. Рабочая сіла няўхільна старэе, і моладзь, якой з гэтым жыць, павінна думаць, як менавіта.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

Экалагічны лікбез
Сумесны праект Звязда

# АКТЫЎНЫ АДПАЧЫНАК — БЕЗ ПАРУШЭННЯЎ

**Зімовы час скончыўся. Вясна — падстава для новых магчымасцяў і радасцяў у аматараў актыўнага адпачынку. Але свежае паветра, сонейка і квецень прыроды не павінны расслабляць паляўнічых і рыбаловаў у плане выканання патрабаванняў прыродаахоўнага заканадаўства. Пра гэта сёння ў нашай рубрыцы чарговы раз нагадваюць спецыялісты Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, звяртаючы ўвагу аматараў актыўнага адпачынку на самыя актуальныя пытанні сезона.**

## ШТО ТАКОЕ ПАЛЯЎНІЧАЯ СХОВАНКА?

**З другой суботы сакавіка ў Беларусі адкрыты веснавы сезон палявання на гусей і качароў качак. У спісе дазволеных да здабычы птушак — гусь белалобая, гуменнік шэры, казарка канадская, а таксама самцы (качары) крыжанкі, чэрнеці чырвонагаловай і чубатай, чырка-трасkунка і чырка-свістунка. Паляваць на іх можна з засады і толькі са схованкі.**
**А з першай суботы красавіка здабываць можна і самцоў слонкі — зброевым спосабам з засады (на цязе).**

Для здабычы гэтых птушак дазволена выкарыстоўваць гладкаствольную паляўнічую зброю, зараджаную выключна шротавымі патронамі, для вышуку і падачы здабытай дзічыны — пэўныя пароды паляўнічых сабак.

Асноўныя асаблівасці палявання выкладзены ў дадатку 2 да Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання. І ўсё ж у Дзяржінспекцыю даволі часта звяртаюцца паляўнічыя з просьбай растлумачыць асобныя пытанні. Што можна лічыць схованкай і як яна павінна быць абсталявана, ці можна дабірацца падранкаў па-за схованкай, у якіх выпадках паляўнічым дазволена карыстацца маламернымі судамі — бо ў перыяд нерастовай забароны перамяшчэнне на іх у рыбалоўных угоддзях, дзе часцяком праводзяцца паляванні, забаронена. Цікавасць паляўнічых асаблівасці выкарыстання падсадных жывёл, чучал, профіляў і вабікаў, а таксама паляўнічых сабак.

Усе гэтыя нюансы растлумачаны ў сумесным лісце Мінлясгаса (ад 14.07.2016 года №08-22/3075) і Дзяржаўнай інспекцыі (ад 18.07.2016 года №03-02-09/1469). Больш падрабязна з імі можна азнаёміцца на сайтах названых афіцыйных структур.

## СПЕЦЫФІКА ВЕСНАВОЙ ЗДАБЫЧЫ

**Спецыялісты Дзяржінспекцыі нагадваюць, што агульная працягласць веснавога сезона палявання на гусей і качароў качак не можа перавышаць чатырох тыдняў (28 каляндарных дзён) запар у прадугледжаным Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання дыяпазоне (у 2017 годзе — з 11 сакавіка па 14 мая). Канкрэтныя тэрміны ўстанаўліваюцца рашэннямі карыстальнікаў паляўнічых угоддзяў.**

Падзел веснавога сезона палявання на некалькі перыядаў не прадугледжаны Правіламі і не дапускаецца. 28 каляндарных дзён з'яўляюцца максімальным перыядам часу (тэрмінам палявання), на працягу якога можа праводзіцца веснавое паляванне на гусей і качароў качак.

З улікам патрабаванняў пункта 116 Правілаў, веснавое паляванне на гусей і качароў качак, у межах устаноўленых карыстальнікам паляўнічых угоддзяў канкрэтных тэрмінаў веснавога сезона палявання на названых жывёл, дазваляецца ў суботу, нядзелю, у дзяржаўныя святы, святочныя дні, аб'яўленыя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь непрацоўнымі, і ў асобныя працоўныя дні ў выпадку іх пераносу Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь на выхадныя дні. Карыстальнікі паляўнічых угоддзяў маюць права ўстанаўліваць дадатковыя два дні на тыдзень, дазволеныя для правядзення названага вышэй палявання. Аб устанаўленні такіх дадатковых дзён палявання карыстальнікі паляўнічых угоддзяў абавязаны праінфармаваць адпаведныя падраздзяленні органаў паляўнічага кантролю, на тэрыторыі адказнасці якіх знаходзяцца паляўнічыя ўгоддзі, не пазней чым за пяць дзён да пачатку сезона палявання.



Пры правядзенні паляўнічых тураў, у тым ліку з удзелам замежных грамадзян, паляванне ў межах устаноўленых карыстальнікам паляўнічых угоддзяў канкрэтных тэрмінаў веснавога сезону палявання на гусей і качароў качак дазваляецца ў дні тыдня ў адпаведнасці з дагаворамі аказання турыстычных паслуг на правядзенне паляўнічых тураў.

Дадаткамі 1, 2 да Правілаў прадугледжаны пералікі паляўнічых жывёл, а таксама дазволеных тэрмінаў, спосабаў і прылад палявання на асобныя віды названых жывёл, у тым ліку ў веснавым сезоне палявання.

Дзяржінспекцыя звяртае асаблівую ўвагу паляўнічых, што ў працэсе палявання дапускаецца здабыча толькі паляўнічай жывёлы, у тым ліку птушак, названых у паляўнічай пуцёўцы. Пры любым законным знаходжанні ў паляўнічых угоддзях у мэтах палявання паляўнічым дазваляецца таксама здабыча ваўка, лісіцы, янотападобнага сабакі, вароны шэрай, сарокі, адстрэл бадзяжных катоў і беспародных сабак з выкарыстаннем спосабаў і прылад палявання, дазволеных для палявання на паляўнічых жывёл, указаных у паляўнічай пуцёўцы.

Нават ненаўмысная здабыча ў працэсе палявання дзікай жывёлы, не аднесенай да паляўнічай, або паляўнічай жывёлы, не ўказанай у паляўнічай пуцёўцы, з'яўляецца незаконнай.

## ПАДВОДНІКІ: ЯК У НАС І ЗА МЯЖОЙ

**У многіх краінах Еўропы падводнае паляванне пад забаронай. Так, у Германіі за занятак падводным паляваннем можна атрымаць да 10 гадоў турмы, цалкам адсутнічае ён у Швецыі, Аўстрыі, Нідэрландах, Бельгіі, Чэхіі і шэрагу іншых краін.**

У Літве з трох тысяч вадаёмаў падводнае паляванне дазволена толькі на сямі на падставе білета рыбалова. У Эстоніі здабываць рыбу такім спосабам можна ўсяго на двух азёрах — Курэмаа і Саад'ярв — і таксама на падставе рыбалоўнай карты. У Латвіі падводнае паляванне дазволена толькі ў вадаёмах, пералік якіх зацвярджаецца Міністэрствам земляробства, у ім — каля 30 рыбалоўных угоддзяў.

Да 2006 года ў Беларусі таксама штогод зацвярджаўся пералік водных аб'ектаў, дзе можна было ажыццяўляць падводнае паляванне. Ён уключаў 34 водныя аб'екты па ўсёй краіне (у тым ліку 16 участкаў рэк): у Брэсцкай вобласці — 7, у Віцебская вобласці — 11, у Гомельскай — 5, Гродзенскай — 6, Магілёўскай — 5. У Мінскай вобласці падводнае паляванне не дазвалялася ні на адным вадаёме і вадацёку. З пералікамі вадаёмаў, на якіх раней дазвалялася падводнае паляванне ў адпаведнасці з пастановамі Мінпрыроды, пры жаданні можна азнаёміцца ў сістэме пошуку прававой інфармацыі «КансультантПлюс».

З пачатку 2006-га і да сярэдзіны 2014 года падводнае паляванне ў краіне стала арганізоўвацца па рашэннях мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Спіс рыбалоўных угоддзяў, дзе можна было займацца падводным паляваннем, значна расшырыўся ў параўнанні з пералікам, які існаваў да гэтага. У той жа час колькасць такіх вадаёмаў і вадацёкаў (на якіх дазвалялася падводнае паляванне) была ў разы меншая за колькасць водных аб'ектаў, на якія у цяперашні час у фондзе запасу рыбалоўных угоддзяў дазваляецца аматарскае рыбалоўства спосабам падводнага палявання (з улікам патрабаванняў пастановы Мінсельгасхарча ад 19.05.2014 года №22 у рэдакцыі 29.03.2016 года №14).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

УНП 100055368

**Открытое акционерное общество**
**«СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ №4»**
**сообщает о проведении Внеочередного собрания акционеров ОАО «Стройтрест №4».**

Собрание состоится 25 мая 2017 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая,17, актовый зал.

ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Стройтрест №4».
2. О внесении изменений в Устав ОАО «Стройтрест №4».

Регистрация участников собрания проводится с 15.00 до 15.45 по предъявлении паспорта, а представителей акционеров – по предъявлении паспорта и доверенности.

Списки акционеров ОАО «Стройтрест №4» для регистрации участников собрания будут составлены по данным реестра акционеров на 18.05.2017.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: с 18.05.2017 г. по 24.05.2017 г. в рабочие дни с 9.00 до 17.00 с перерывом с 13.00 до 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17, 3-й этаж (кабинет 302), в день проведения собрания – с 9.00 до 14.00 по месту его проведения.

Справки по тел. в г. Минске: 334-10-03.

Наблюдательный совет

Утерянные бланки квитанций формы 1-СУ серия СВ №0424971, №0424973–0424979 **считать недействительными.** УНП 100985903

## Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно

**(ул. Фестивальная, (микрорайоны «Зарица-4», «Заболоть») 13 июня 2017 года**

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок У-1* | ул. Фестивальная, в районе домовладения №30 | 0,0810 | 440100000002009119 | 2 728,4 | 39 242,36 | 7 000 |
| 2 | Земельный участок У-129* | микрорайон «Заболоть» | 0,0992 | 440100000002007840 | - | 12 780,17 | 2 400 |
| 3 | Земельный участок У-1441* | микрорайон «Зарица-4» | 01015 | 440100000002006889 | - | 11 852,39 | 2 200 |

*Инженерные коммуникации на участке отсутствуют.

Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства одноквартирного жилого дома.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 № 49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 13 июня 2017 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 ( актовый зал).**

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток не позднее **7 июня 2017 года** в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет №3012000041810 в филиале №400 Гродненском областном управлении ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению;

представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы;

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. 57 с 15 мая по 7 июня 2017 года включительно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 46, 72 05 37, официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by**




■ Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары

**Рыцец Брэсцкага раёна**

# МЯЖА, ШТО ПРАЙШЛА ЦЕРАЗ СЭРЦА

**За ўсё сваё жыццё я не бачыла такой вёскі, дзе ўсе двары вясной былі б расквечаны лясной ветраніцай. Гэта адзін з першацветаў, які часам памылкова называюць падснежнікам. Белыя пяшчотныя кветачкі растуць сапраўдным дываном на пустых падворках да самых ганкаў. І не дзіва: навакольны лес заваёўвае вёску. Але не гэта галоўная адметнасць населенага пункта Рыцец. Вёска аказалася за лініяй дэмаркацыі дзяржаўнай мяжы. Цяпер, як вядома, праводзіцца дэмаркацыя нашай мяжы з Украінай. Паласа, па якой пройдзе агароджа, ужо адведзеная і абазначаная. Да Рыцеца яшчэ застаецца некалькі кіламетраў. Такія рэаліі.**

Цяпер у вёсцы засталося пяцёра пастаянных жыхароў. Перыядычна паміж імі ўзнікаюць чуткі, што вось правядуць дэмаркацыю, а людзей адселяць у Тамашоўку. Але ў сельскім Савеце лічаць, што для такіх чутак няма падстаў, ніхто не збіраецца нікога высяляць, няма такога рашэння, ды і сродкаў ніхто не выдзяляў. А людзі паціху наракаюць на свой лёс: вось так жылі яны жылі, хлеб расцілі, дзяцей гадавалі, спраўлялі вяселлі ды хрысціны. А потым да іх прыйшла **мяжа**. І ўсё перамянілася.

Рыцец — крайні паўднёвы пункт Брэсцкага раёна, ад цэнтра сельсавета Тамашоўкі ён размешчаны за 10 кіламетраў. А найбліжэйшая ўкраінская вёска Кашары за 300 метраў. Раней гэта і ўспрымалася амаль як адзін населены пункт, магазін у Кашарах быў агульным. Як і школа, іншыя сацыяльныя аб'екты.

Галіна Яўгенаўна Дубіна, жыхарка Рыцеца, усё жыццё адпрацавала настаўніцай ва ўкраінскай школе. У яе вельмі паказальная біяграфія. Сама Галіна родам з украінскай вёскі Сыкунь. Пасля заканчэння педінстытута ў Луцку прыехала сюды працаваць настаўніцай пачатковых класаў. Выйшла замуж за беларускага хлопца, ды і засталася ў Рыцецы назаўсёды. Тут, дарэчы, амаль усе сем'і такія — беларуска-ўкраінскія. Школа, куды накіравалі маладога спецыяліста, спачатку была ў прыстасаваным памяшканні ў Кашарах, потым пабудавалі новую ў Альшанцы. Усё роўна хадзіць на работу было не больш за кіламетр. З Рыцеца да яе ў клас адзін час 13 дзяцей хадзіла. Так і вучыла ўсіх навакольных дзяцей чытаць, пісаць, лічыць. Мовамі навучання былі ўкраінская і руская. Далей дзеці ішлі ва ўкраінскую сярэднюю школу. Потым многія паступалі ў ВНУ, нярэдка ў Брэст. І пасля падзей 1991 года некаторы час усё заставалася амаль па-ранейшаму. Галіна Яўгенаўна працавала ў школе, у 1997 годзе выйшла на пенсію. А праз год, у 1998 годзе, ім забаранілі хадзіць у магазін. У Рыцец пайшла аўтакрама.


Галіна ДУБІНА.

Спачатку людзі вельмі абураліся. Як гэта? Магазін стаіць за трыста метраў, па сутнасці, на суседняй вуліцы, ні сцяны да яго, ні агароджы, а хлеба купіць зайсці не маеш права. Ну і, вядома, парушалі забарону. Але да парушальнікаў сталі прымаць, як той казаў, меры стрымлівання. Адным словам, паступова адвучылі ад паходаў у суседнюю вёску.

Памежныя службы з абодвух бакоў зразумець можна. Яшчэ з 90-х праз навакольныя лясы пайшлі патокі кантрабанды. Спыніць яе можна было толькі рашучымі дзеяннямі, хоць і ўмоўным, але надзейным кардонам. Вось і траплялі пад патэнцыяльнае падазрэнне ўсе, хто тут паяўляўся, у тым ліку мясцовыя жыхары.

І людзі гэта, здаецца, разумеюць, а вось душа і сэрца працівяцца. Колькі на гэты конт было сварак і высвятленняў адносін з пагранічнымі нарадамі! «Я тут нарадзіўся, басаном бегаў, еду да маці ў свой бацькоўскі дом, а ты мяне затрымліваеш, нібы шпіёна!» — не раз крычаў былы жыхар вёскі. А ў памежніка свая работа, яму прадпісана правяраць і падазраваць усіх. Асабліва пакрыўджаная на новыя парадкі Ірына Фёдараўна Ляўчук.


Ірына ЛЯЎЧУК.

Яна таксама родам з украінскага сяла, выйшла замуж у Рыцец. Цяпер жыве адна, муж памёр. Дзеці прыязджаюць часта, асабліва брэсцкі сын, у якога рэжым работы: трое сутак праз трое. У тры свабодныя дні ён едзе да маці, працуе па гаспадарцы і на агародзе. Бывае, а палове пятай раніцы на скутэры дабіраецца на цягнік. Ну і вечна трапляе пад праверкі.

У такой сітуацыі амаль немагчыма пазбегнуць перагібаў. Напрыклад, праверылі групу людзей, якія вярталіся з пахавання аднавяскоўца, а людзі гэта ўспрынялі ледзь не як абразу. І што тут зробіш? Ніхто ж не думаў раней, што будуць межы з усімі наступствамі. Самі ж лініі меж, як і лініі дэмаркацыі, ва ўсе часы праводзіліся, як правіла, у сталічных кабінетах. А людзі жывуць вось тут, на канкрэтным лапіку зямлі.

Галіна Дубіна паказвае памежны слуп суседняй дзяржавы, які паявіўся тут нядаўна. «Гэта нам напамін, што мы замежнікі», — смяецца былая настаўніца. І расказвае, што за гэтым слупам, крыху далей, знаходзіцца вельмі глыбокае прыроднае возера пад назвай Рыцец, якое мясцовыя жыхары заўсёды лічылі сваім. Цяпер яно замежнае.

— Некалі на курсах павышэння кваліфікацыі ў Луцку нам адзін навуковец лекцыю чытаў, — працягвае Галіна Яўгенаўна. — Ён расказваў, што яшчэ ў панскія часы нейкі аматар прыроды аднойчы памецў шчупака і адпусціў у Свіцязьскае возера. Дык тую рыбіну потым вылавілі ў нашым возеры Рыцец. Такім чынам, паводле яго версіі, усе Шацкія азёры маюць нейкія падземныя плыні. Вось такія дзівосы тутэйшай прыроды. А якія яны прыгожыя, маляўнічыя тыя азёры! Ды і ў нас тут, бачыце, прыгажосць якая!

І праўда, амаль у кожнага каля дома невялікі вадаём, і невядома, ці гаспадары ў свой час паклапаціліся, ці сама прырода. Тут вада блізка, выкапаць штучнае азярцо, здаецца, не праблема. А яшчэ з усіх бакоў да вёскі лясы падступаюць, і гэта накладвае адбітак. Дзікі, здараецца, бессаромна падыходзяць ледзь не да самых сядзіб. Некалькі разоў ужо сваім паяўленнем напужалі вяскоўцаў.

Паводле слоў былой настаўніцы, жывецца ім у сваёй вёсцы зусім нядрэнна. Галоўнае, што Галіна і Іван Дубіны ўдваіх. Пакуль крыху ёсць сілы, займаюцца гаспадаркай. У іх ёсць нават конь, а яшчэ куры, козачка. Кожны год садзяць агарод. Вясной, вядома, клопатаў прыбаўляецца. Летам чакаюць у госці ўнукаў, якіх дзед і бабуля маюць шасцёра, ужо і двое праўнукаў падрастаюць. Сын жыве ў Брэсце, да бацькоў наведваецца нярэдка. Раз на тыдзень, па чацвяргах, у вёску прыходзіць аўтакрама. Гандлёвы работнік запісвае ўсе заяўкі, стараецца выконваць. А магазін у суседніх Кашарах, дарэчы, не так даўно закрылі. Да іх таксама прыходзіць крама на колах.

Пошта прывозіць пенсію. Правесці агляд заязджае медработнік. Каб жыхары вёскі маглі прайсці флюараграфію, сёлета па іх прыязджала машына Тамашоўскай амбулаторыі. А вось электраэнергія ў Рыцец па-ранейшаму паступае з Украіны.

Старшыня Тамашоўскага сельскага Савета Алена Бурак расказала, што так было заўсёды. Праўда, у 2011 годзе Шацкія раённыя электрасеткі раптам прыслалі папярэджанне, што больш не будуць сілкаваць беларускую вёску. Цягнуць дзясятак кіламетраў лініі для пяці, хай тады яшчэ для дзесяці жыхароў было б вельмі дорага. Давялося ўзгадняць пытанне на ўзроўні міністэрстваў двух краін. Аказалася, што па перыметры мяжы ёсць і ўкраінскія вёскі, якія падключаны да беларускіх электрасетак. Таму ў Мінску і Кіеве дамовіліся, што жыхары будуць плаціць за электраэнергію ў сваіх краінах, а дзяржавы различацца між сабой. Больш пытанняў не ўзнікае.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

# АД «ХАЛОПА»-ЖУКА ДА «АКУЛЯРАЎ У МІНУЛАЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Мы вельмі ўдзячныя Нацыянальнай акадэміі навук. Дзякуючы вядомаму даследчыку Вользе Мікалаеўне Ляўко, гонар музея — археалагічныя экспанаты. Іх прыблізна 11 тысяч. У тым ліку адна тысяча — у асноўным фондзе. Раскопкі курганоў у раёне праводзіліся з савецкага часу. Але самыя паспяховыя былі ў 1999—2000-х гадах, — расказвае **дырэктар музея Ірына ПІКУЛІК.**

Па знойдзеных падчас раскопак чэрапах мінскія спецыялісты зрабілі рэканструкцыю крывічаніна і крывічанкі. У экспазіцыі — багаты пахавальны інвентар, жаночыя ўпрыгажэнні (шкляныя бранзалеты, скроневыя кольцы), узбраенне ратнікаў Друцка...


Дырэктар Ірына ПІКУЛІК паказвае музейную экспазіцыю.

Дарэчы, сам Друцк упершыню згадваецца ў знакамітым Друцкім Евангеллі — рукапісным помніку ўсходнеславянскай пісьменнасці XIV стагоддзя. Старажытная кніга знаходзіцца ў бібліятэцы Сібірскага аддзялення РАН (у Новасібірску). У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАН Беларусі ёсць фотакопія Евангелля.

У наш час Друцк — аграгарадок. А калісьці быў важным пунктам на гандлёвым шляху з «варагаў у грэкі». У 1001 годзе тут пабудавалі адну з першых праваслаўных цэркваў на тэрыторыі сучаснай Беларусі — Прасвятой Багародзіцы. Друцкае Евангелле спачатку знаходзілася менавіта ў гэтым храме.

Князі Друцкія займалі важнае становішча ў Полацкім княстве. А потым — у Вялікім Княстве Літоўскім. Родам з князёў Друцкіх была Соф'я Друцкая (Гальшанская), жонка вялікага князя літоўскага і караля Польскага Ягайлы (Уладзіслава).

— Друцк — адзінае месца ў краіне, дзе захаваліся ўсе рэльефы забудовы горада эпохі Сярэднявечча. Там можна ўбачыць дзядзінец (дзе жыў князь), вакольны горад, пасад, роў, які падчас паводкі запаўняўся вадой. Часткова — курганны могільнік, — распавядае Ірына Пікулік.

Захаваўся і вал. Яго даўжыня на тэрыторыі раёна — каля 40 кіламетраў. Пачынаецца ён ад вытокаў ракі Друць. Гэта — былая мяжа паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай. Унікальнасць Талачына ў тым, што ў выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай (у 1772 годзе) мяжа прайшла па згаданай вышэй рацэ. Усходняя частка Талачына ўвайшла ў склад Расійскай імперыі, а заходняя да 1793 года (да другога падзелу Рэчы Паспалітай) была ў складзе гэтай федэратыўнай дзяржавы.

## ...І не толькі

У музеі можна ўбачыць розныя (у наш час — экзатычныя) прадметы быту.

Напрыклад, металічны жук. Для чаго? Упрыгожанне? Аказваецца, гэта — «халоп» (так называлі ў народзе), каб здымаць боты. Гэты і іншыя тавары прадавалі на тутэйшых кірмашах. Калісьці ў Талачыне іх арганізоўвалі кожны тыдзень. А самыя масавыя: Мікалаеўскі, Ільінскі і Успенскі — на праваслаўныя святы.


Так выглядаў старажытны Друцк.

У музеі добрыя экспазіцыі, прысвечаныя Першай і Другой сусветным войнам. У прыватнасці, прадстаўлены амуніцыя, прадметы экіпіроўкі, узнагароды. Ёсць стэнд, які расказвае пра вядомага савецкага танкіста. У бai 20 чэрвеня 1941 года ў якасці камандзіра гарматы танка Андрэй Усаў падбіў 22 нямецкія танкі. А ўсяго за гады вайны, па некаторых звестках, знішчыў больш за 40. Ён нарадзіўся ў 1917-м на тэрыторыі цяперашняга Сенненскага раёна. Памёр у 1986-м. Пахаваны ў Талачыне.

З раёнам звязанае жыццё многіх выдатных людзей. Тут з'явіўся на свет народны мастак СССР, Герой Беларусі Міхаіл Савіцкі. Ён падарыў землякам асабістыя рэчы, у тым ліку і пэндзлі. Іх можна ўбачыць у музеі.

Талачынская зямля дала краіне вядомых паэтаў і пісьменнікаў. Сярод іх: Іосіф Васілеўскі, Вера Вярба, Міхась Зарэцкі, Алесь Рылько, Анатоль Мяснікоў і іншыя. Тут працаваў і вялікі песняр беларускага народа Якуб Колас. Пра вядомых усім людзей таксама раскажуць у музеі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ,** *pukshanski@zviazda.by* *Талачынскі раён.*

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж», г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, 3-й этаж. Тел.: +375 17 256 90 12, +375 17 256 90 01 |

**Предмет аукциона**

**Недвижимое имущество, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, д. 9А**

| № п/п лота | Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Здание холодного склада (литер Б 1/м)** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 303 кв. м | 500/С-31540 |
| **Составные части и принадлежности** | Площадка из плит дорожного покрытия, забор ж/б с воротами металлическими | | | |
| **Оборудование** | Кран-балка электрическая, г/п 5 т, инв. №41, дата ввода в эксплуатацию – 1991 г. | | | |
| **Обременения** | Договор аренды. Подробная информация на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY | | | |

Начальная цена с НДС 20% – **115 199,50 белорусских рублей**
Шаг аукциона – **5 759,98 белорусских рублей**

| № п/п лота | Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|---|
| 2 | **Здание склада с гаражом (литер А 2/кп)** | Здание многофункциональное | 476 кв. м | 500/С-31450 |
| **Составные части и принадлежности** | Площадка из плит дорожного покрытия | | | |
| **Оборудование** | Неисправная кран-балка электрическая, г/п 2 т, инв. №40 | | | |
| **Обременения** | Договор аренды. Подробная информация на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY | | | |

Начальная цена с НДС 20% – **212 810,40 белорусских рублей**
Шаг аукциона – **10 640,52 белорусских рублей**

| № п/п лота | Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|---|
| 3 | **Здание столярной мастерской (литер В 1/м)** | Здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель | 68 кв. м | 500/С-32065 |
| **Составные части и принадлежности** | Площадка из плит дорожного покрытия | | | |
| **Обременения** | Договор аренды. Подробная информация на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY | | | |

Начальная цена с НДС 20% – **32 018,76 белорусских рублей**
Шаг аукциона – **1 600,94 белорусских рублей**

**Сведения о земельном участке: лоты 1–3 расположены** на неделимом земельном участке площадью 0,2892 га, предоставленном на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений производственной базы.
Ограничения прав: обеспечение доступа для производства ремонтно-восстановительных работ, пл. 0,2892 га

**Недвижимое имущество, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, д. 11**

| № п/п лота | Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|---|
| 4 | **Здание производственного корпуса (литер А 1/м)** | Здание специализированное для производства строительных материалов | 1820,0 кв. м | 500/С-24874 |

**В состав Лота входит следующее оборудование:**
- кран мостовой электрический подвесного типа 2-13.0-12.012, инвентарный номер 501, дата ввода в эксплуатацию – 2010 г.

| | |
|---|---|
| **Обременения** | Договор аренды. Подробная информация на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY |

**Начальная цена с НДС 20% – 346 474,18 белорусских рублей (BYN)**
**Шаг аукциона – 17 323,71 белорусских рублей (BYN)**

| № п/п лота | Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|---|
| 5 | **Здание галереи (литер Г 1/к)** | Здание неустановленного назначения | 65,0 кв. м | 500/С-25651 |

**Начальная цена с НДС 20% – 18 531,63 белорусских рублей (BYN)**
**Шаг аукциона – 926,58 белорусских рублей (BYN)**

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Лоты №№4–5 расположены на неделимом земельном участке площадью 2,6107 га, предоставленном на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений производственной базы. Ограничения (обременения): обеспечение доступа для производства ремонтно-восстановительных работ – эксплуатирующим организациям – владельцам инженерных сооружений, площадь 2,6107 га |
| **Порядок ознакомления по лотам №№1–5** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Пасиницкий Алексей Леонидович, начальник участка малой механизации, контактный телефон +375-29-334-30-43 |

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** www.cpo.by

**Оборудование, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, д. 11**

| № п/п лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 6 | 22 | Вертикально-сверлильный станок типа 2А-135, 1964 г. в. | 914,94 | 45,75 |
| 7 | 424 | Ленточно-пильный станок типа ARG-290 PLUS, 2007 г. в. | 3 437,57 | 171,88 |
| 8 | 23 | Станок настольно-сверлильный типа КС-12 | 197,60 | 9,88 |
| 9 | 498 | Станок радиально-сверлильный типа 2К550 в комплекте со столом, тисками, патроном сверлильным резьбовым, 2010 г. в. | 16 230,06 | 811,50 |
| 10 | 17 | Токарно-винторезный станок типа 1К-62, 1966 г. в. | 2 481,12 | 124,06 |
| 11 | 527 | Установка компрессорная типа К-2, 2012 г. в. | 568,23 | 28,41 |
| 12 | 273 | Устройство для отсоса пыли, 1977 г. в. | 161,74 | 8,09 |
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Пасиницкий Алексей Леонидович, начальник участка малой механизации, контактный телефон +375-29-334-30-43 | | | |

**Оборудование, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Гурского, 16а**

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 13 | 517 | Навесное оборудование: щетка дорожная типа НО-86 | 143,69 | 7,18 |
| 14 | 28 | Плоскошлифовальный станок типа 3Д 711 | 5 200,91 | 260,05 |
| 15 | 12 | Радиально-сверлильный станок типа 2Л 53 | 2 212,01 | 110,60 |
| 16 | 242 | Станок токарно-винторезный типа 6Б 16П | 4 124,91 | 206,25 |
| 17 | 245 | Станок точильно-шлифовальный типа 3Б634 | 789,30 | 39,47 |
| 18 | 30 | Станок универсальный токарный типа 16Е | 1 494,67 | 74,73 |
| 19 | 29 | Станок универсальный фрезерный типа 672001ф | 2 092,45 | 104,62 |
| 20 | 31 | Токарно-винторезный станок типа 1А 62 | 2 092,45 | 104,62 |
| 21 | 15 | Станок токарный типа 16 Е 16 КП | 1 733,79 | 86,69 |
| 22 | 26 | Фрезерный станок типа СФ 40 ПФ 1 | 2 092,45 | 104,62 |
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Быковский Леонид Эдуардович, начальник автотранспортного участка, контактный телефон +375-29-654-92-93 | | | |

**Транспорт и спецтехника, расположенные по адресу: г. Минск, ул. Гурского, 16а, в составе:**

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 23 | 218 | Кран КС 357721 (рег. знак АА 6063-7) | 4 453,56 | 222,68 |
| 24 | 268 | Полуприцеп ПЛ 12-12 (рег. знак 2892 АА-7), 1992 г. в. | 1 176,41 | 58,82 |
| 25 | 131 | Прицеп ПЛ-12-12 (рег. знак 2949 КА), 1992 г. в. | 1 176,41 | 58,82 |

**Спецтехника, расположенная по адресу: г. Кричев, ул. Комсомольская, 103а, в составе:**

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 26 | 223 | Кран РДК 250-3, 1990 г. в. | 12 184,26 | 609,21 |
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Быковский Леонид Эдуардович, начальник автотранспортного участка, контактный телефон +375-29-654-92-93 | | | |

**Транспорт и оборудование, расположенные по адресу: г. Гродно, ул. Индустриальная, 2а, в составе:**

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 27 | 456 | Грузовой специальный бетоносмеситель МАЗ 630305-249 СМБ-270 (рег. знак АВ 7826-7), 2007 г. в. | 11 022,02 | 551,10 |
| 28 | 619 | Модульная автозаправочная станция | 600,00 | 30,00 |
| 29 | 893 | Сварочный аппарат «Оливер» ВД-350, 2013 г. | 1140,00 | 57,00 |
| 30 | 688 | Легковой автомобиль GAZ 31105-120 (рег. №2326 АЕ-4), 2004 г. в. | 660,00 | 33,00 |
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Марчик Петр Иванович, директор филиала СУ-110, контактные телефоны: 8 0152 530-712 (716, 728) | | | |

**Транспорт, спецтехника и оборудование, расположенные по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, д. 254, в составе:**

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 31 | 150081 | Автомобиль УАЗ-3303-018, рег. №АВ 3985-3 (1994 г. в.) | 1 516,50 | 75,83 |
| 32 | 930 | Автомобиль грузовой бортовой МАЗ (MAZ) 53371 (1990 г. в.) | 1 146,60 | 57,33 |
| 33 | 998 | Автобус вагон ГАЗ (GAZ) – 2705 (2000 г. в.) | 934,15 | 46,71 |
| 34 | 150035 | Полуприцеп бортовой МАЗ (MAZ) 938662-043, 2007 г. в. | 2 462,95 | 123,15 |
| 35 | 150021 | Станция компрессорная передвижная ПКСД-5-25 ДМУ1 | 1 486,10 | 74,31 |
| 36 | 501 | Ножницы листовые металлические НДЗ318Б | 2 080,75 | 104,04 |
| 37 | 1008 | Подъемник К-1В с электролебедкой | 318,50 | 15,93 |
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00, по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 254. Ответственное лицо: Дриневский Виктор Васильевич, производитель работ, контактные телефоны: +375 29 603-49-02 (Velcom), 8 0232 46-09-03 | | | |

**Транспорт и оборудование, расположенные по адресу: г. Брест, ул. Гродненская, д. 55Д, в составе:**

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 38 | 373 | Подмости ПВС 12, 1979 г. в. | 3 702,64 | 185,13 |
| 39 | 242 | Преобразователь частоты ПЧ-4/42-200У2 (2010 г. в.) Pfaff Silberblau Германия | 285,60 | 14,28 |
| 40 | 36 | Станок вертикально сверлильный 2С132 (1990 г. в.) | 2 052,67 | 102,63 |
| 41 | 997 | Тележка гидравлическая (PFAFF 20-115) (2010 г. в.) Pfaff Silberblau Германия | 168,80 | 8,44 |
| 42 | 400 | Мойка холодной воды (FTS 190) (2010 г. в.) IP Cleaning S.p.A. Italy | 184,80 | 9,24 |

**Оборудование, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Я. Купалы, 120/2**

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 43 | 81 | Динамометрический ключ ЭДК 1-1500, 2005 г. в. | 453,60 | 22,68 |
| 44 | 349 | Лебедка электрическая ТЛ-7А-1, 1987 г. в. | 1 080,00 | 54 |
| 45 | 255 | Сварочный агрегат АДД-4004М, 2004 г. в. | 3 105,00 | 155,25 |
| 46 | 248 | Станция подогрева бетона КТП-ТО 80-86 У-1, 1990 г. в. | 495,00 | 24,75 |
| 47 | 22 | Точильно-шлифовальный станок 3М634, 1968 г. в. | 225,00 | 11,25 |
| 48 | 108 | Токарно-винторезный станок CU-400, 1987 г. в. | 5 103,00 | 255,15 |

**Капитальное строение, расположенное по адресу: г. Пинск, ул. Гайдаенко, д. 55В, Брестская область**

| № п/п лота | Наименование (назначение) | Составные части и принадлежности | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|---|
| 49 | **Гаражи** (здание специализированное транспорта) | Склад, уборная, ворота, калитка, забор | 280,6 | 130/С-30666 |

**Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,1459 (га), предоставлен на праве постоянного пользования для размещения промышленных объектов

**Начальная цена с НДС 20% – 27 087,24 белорусских рублей (BYN)**
**Шаг аукциона – 1 354,36 белорусских рублей (BYN)**

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Климчук Василий Григорьевич, директор филиала СУ-159, контактный телефон +375 296592523 |

**Оборудование, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 78а, в составе:**

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 50 | 4098 | Блок контейнер БК-1, 2014 г. | 1 532,86 | 76,64 |
| 51 | 596 | Подмости б/у | 2 476,15 | 123,81 |
| 52 | 633 | Подмости передвижные электрические ППЭ-12.01.А | 3 655,27 | 182,76 |
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Куткович Александр Александрович, производитель работ, тел. +375 29 246 68 24; Жаглевский Дмитрий Давыдович, директор филиала СУ-86, контактный телефон +375 29 601 62 44 | | | |

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** www.cpo.by

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с №3012343260010; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты: по лотам №№1–5, 49** не более 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.
**По лотам №№6–48, 50–52** не более 10 (десяти) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением СовМина РБ от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне представляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5%

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении повторного аукциона опубликовано в г. «Звязда» 15.04.2017 г.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **02.06.2017** в 13.00 по адресу: **г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, 3-й этаж, ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **31.05.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

## Извещение о проведении 25 мая 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскремстрой»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества)** | «Здание мастерских, литер А 1/бл» общей площадью 193 кв. м, инв. номер в ЕГРНИ 500/С-38001, адрес: г. Минск, ул. Куприянова, д. 2; «здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, литер Б 1/бл» общей площадью 36 кв. м, инв. номер в ЕГРНИ 500/С-38002, адрес: г. Минск, ул. Куприянова, 2/1; производственная площадка с асфальтовым покрытием, инвентарный номер 42; производственная площадка с бетонным покрытием, инвентарный номер 38; забор из металлической сетки с ж/б элементами и воротами, инвентарный номер 39 |
| **Сведения о земельном участке** | Кадастровый номер 500000000005001794, площадь – 0,2112 га |
| **Сведения о продавце** | ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220030, г. Минск, телефон (017) 226-41-15 |
| **Сведения об организаторе торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефон (017) 327-05-62 |
| **Начальная цена предмета торгов с учетом НДС** | 149 173,60 бел. руб. |
| **Размер задатка** | 14 900,00 бел. руб. |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.
Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию документа, подтверждающего внесение задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.
Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в торгах.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.
Торги проводятся 25 мая 2017 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 15.05.2017 по 23.05.2017 включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.
Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 200-99-78, 226-41-14 (ОАО «Минскремстрой»)

■ Ісціна ў прабірцы

# ШЭРЛАК ХОЛМС АДПАЧЫВАЕ,

## калі ў справу ўступаюць хімікі-эксперты

**Свінец, ртуць, мыш'як, сурма... Колькі людзей сталі ахвярамі атручэння гэтымі рэчывамі, напэўна, ніхто і ніколі не даведаецца. Той жа мыш'як калісьці вельмі цаніўся за свае касметычныя ўласцівасці. Жанчыны спрабавалі з яго дапамогай дасягнуць свежага колеру твару і мажнасці фігуры, а мужчыны — павышалі сваю сексуальную патэнцыю. Сурма ўвогуле разглядалася ўрачамі ў якасці панацэі ад усіх хвароб... Сярод ахвяр свінцовага атручвання — Франсіска Гоя ці Ван Гог, які любіў высмоктваць свінцовыя фарбы са сваіх пэндзляў.**

**У 1930-я гады галоўным інгрэдыентам у надзвычай папулярных крэмах для выдалення валасоў стаў адкрыты яшчэ ў 1863 годзе талій. Але пасля апублікавання рамана Агаты Крысці «Віла «Белы конь» гэту небяспечную атруту з запаволеным дзеяннем пачалі шырока выкарыстоўваць у крымінальных мэтах. Вядомага майстра дэтэктыўнай прозы абвінавацілі ў тым, што менавіта яна падказала патэнцыяльным злачынцам спосаб атручвання солямі талію.**

**На жаль, але і сёння атручэнні — не такая ўжо рэдкая з'ява. Сярод прычын гвалтоўнай смерці яны знаходзяцца на другім месцы. Прычым нярэдка беларусы гінуць з прычыны ўласнага недагляду і глупства. Толькі чадны газ уносіць жыцці да тысячы чалавек за год. Пра гэта добра ведаюць эксперты-хімікі галоўнага ўпраўлення судова-медыцынскіх экспертыз Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, для якіх такія выпадкі — не проста статыстыка.**



Людміла СОМАВА: «Атамна-абсарбцыйны спектрометр вызначае ўтрыманне ў біялагічных узорах таксічных металаў, а таксама і мыш'яку».

### СМЕРЦЬ АД... ЛЕКАЎ

— Наша ўпраўленне і падобныя структуры ў абласцях займаюцца экспертызай біялагічных аб'ектаў на наяўнасць у іх атрутных рэчываў, — тлумачыць **начальнік упраўлення судова-хімічных экспертыз Юрый СІНЬКЕВІЧ.** — Калі судова-медыцынскі эксперт пры ўскрыцці бачыць прыкметы атручэння, ён прызначае мэтавую экспертызу. Больш вопытны спецыяліст можа адразу накіраваць экспертаў-хімікаў у патрэбнае рэчышча. Але большасць атрутных спалучэнняў уздзейнічаюць на арганізм, не пакідаючы там слядоў сваёй прысутнасці, таму канкрэтнай марфалагічнай карціны агульны эксперт не бачыць. І тады наша задача або ўстанавіць рэчыва, якое стала прычынай смерці чалавека, даць яго колькасную ацэнку, або выключыць магчымае кола таксічных спалучэнняў. Адмоўны вынік — таксама вынік.

Дарэчы, па навуковых звестках, на біялагічны арганізм могуць уздзейнічаць каля 10 тысяч хімічных спалучэнняў. Натуральна, што з эканамічных прычын шукаць усе іх немэтазгодна. Да таго ж гэта і немагчыма зрабіць за кароткі час (на экспертызу адводзіцца максімум месяц). У пералік спалучэнняў, якія ў першую чаргу шукаюць эксперты, было ўключана каля некалькі сотняў найменняў: калі спіс складаўся, пад увагу бралася статыстыка атручэння гэтымі рэчывамі, іх уласцівасці, высокая таксічнасць і даступнасць шырокім слаям насельніцтва.

— Майце на ўвазе, што прычынай смерці чалавека могуць стаць самыя банальныя рэчывы, якія ёсць у кожнай хатняй аптэчцы, — уводзіць у курс справы **намеснік начальніка ўпраўлення судова-хімічных экспертыз Людміла СОМАВА.** — Гэта ацэтылсаліцылавая кіслата, парацэтамол, ібупрафен, анальгін, любімая ўсімі жанчынамі но-шпа. Усё залежыць толькі ад дозы. Адна таблетка — гэта лячэбная доза, але калі ўпакоўку з аспірынам знайшло ваша дзіця і праглынула тры-чатыры таблеткі ці, напрыклад, лякарства трапіла ў арганізм сабакі або ката, усё можа скончыцца лятальным выпадкам. Прычынай смерці можа стаць той жа лідакаін, які патрабуецца для растварэння сухога антыбіётыка. Яго небяспека ў тым, што ён запускае механізмы імгненнага анафілактычнага шоку. Быў выпадак, калі жанчына папрасіла ў аптэцы лідакаін, не патлумачыўшы, для якіх мэт. І ёй прадалі 10-працэнтны раствор замест 1-працэнтнага. Растварэнне антыбіётыка ў такім растворы скончылася для дзіцяці трагічна.



Фота Надзеі БУЖАН.

Эксперт-хімік Аляксандр СТАРЭНКОЎ працуе на высокаэфектыўным вадкасным храматографе, які вызначае лекавыя спалучэнні.

Вельмі легкадумна людзі з немедыцынскай адукацыяй ставяцца і да гарачкапаніжальных сродкаў. Пры высокай тэмпературы вып'юць таблетку і чакаюць імгненнага эфекту, а пры грыпе, напрыклад, не так і лёгка знізіць тэмпературу. Праз гадзіну зноў прымаюць таблетку, затым яшчэ адну...

Бацькі, якія знаходзяцца ў паніцы, могуць вельмі лёгка «нашпігаваць» сваё дзіця лекамі: у ход ідуць ібупрафен, парацэтамол.

Клінічныя фармаколагі сцвярджаюць, што **10 таблетак парацэтамолу, якія трапляюць у арганізм адначасова, — гэта гарантаванае сур'ёзнае пашкоджанне печані, а 20 таблетак ужо могуць выклікаць смерць.** Таму трэба вельмі строга прытрымлівацца інструкцый урача і не займацца самалячэннем...

### ВЫПІЎ І... НА ПАГОСТ

З шырока даступных рэчываў, якімі труцяцца беларусы, трэба згадаць бытавыя растваральнікі, якія прадаюцца ў гаспадарчых крамах, тармазныя, паяльныя вадкасці, шклоачышчальнікі...

«Зараз вельмі актуальныя атручэнні спіртаўтрымліваючымі вадкасцямі, якія змяшчаюць метанол і этыленгліколь. Яны лёгка ўсмоктваюцца праз мембраны, трапляюць у мозг, уздзейнічаюць на цэнтральную нервовую сістэму. І для лятальнага канца дастаткова зусім невялікай іх колькасці, — папярэджвае Юрый Сінькевіч. — Усяго 5—10 мілілітраў метанолу хопіць для таго, напрыклад, каб аслепнуць. А паяльная вадкасць утрымлівае шмат цынку: гэты таксічны метал разбуральна ўздзейнічае на ўнутраныя органы...»

Статыстыка сведчыць: на этылавы спірт прыпадае 70 працэнтаў усіх атручэнняў. Нават якаснага алкаголю можна выпіць столькі, што ўсё скончыцца для чалавека лятальна.

У сельскай мясцовасці выпадкова можна атруціцца ядахімікатамі і рэчывамі, якія прапануюцца дачнікам у вялікай колькасці — для павышэння ўраджаю ці барацьбы са шкоднікамі. Здараецца, што ветэрынары атручваюцца селенам, паколькі маюць доступ да селеніту натрыю.

**Рэчыва яшчэ не трапіла на наш рынак, а мы ўжо ведаем, як яно будзе паводзіць сябе ў арганізме, і што нам трэба шукаць.**

Аднойчы спецыялісты знайшлі 50-працэнтны раствор селеніту натрыю ў «лячэбнай» вадкасці, якую прапісаў свайму пацыенту так званы знахар з Віцебскай вобласці. Абяцаў з яе дапамогай вылечыць усе хваробы, але пацыенту станавілася ўсё горш і горш, пакуль той не звярнуўся па дапамогу да ўрачоў. Так гэта «цуда-лякарства» і трапіла ў лабараторыю...

Увогуле **сур'ёзную небяспеку ўяўляюць розныя солі, знешнія падобныя на кухонную.** І калі ў кагосьці ёсць доступ да хімічных рэактываў, усім членам сям'і трэба быць вельмі ўважлівымі і сачыць, каб тыя не трапілі на кухню. У 2001 годзе ў адной сям'і атруціліся адразу чатыры чалавекі: бабуля, дзядуля, іх дачка і ўнук. Ядам аказаўся банальны нітрыт натрыю. Яго дабаўляюць, напрыклад, у каўбасу для атрымання прыгожага ружовага колеру. У мікрадозах нітрыт натрыю не ўяўляе пагрозы, але адной чайнай лыжкі яго дастаткова для таго, каб забіць чалавека. Як паказала хімічная экспертыза, нітратам натрыю былі пасолены ўсе стравы ў гэтым доме.

— Пасля таго, як у паліва перасталі дабаўляць тэтраэтылсвінец, адразу спыніліся атручэнні свінцом, — канстатуе Юрый Сінькевіч. — Гэта вельмі таксічнае спалучэнне, якое хутка трапляе ў галаўны мозг, і ўсё завяршаецца лятальным канцом. І, нават, калі чалавек застаецца жывы, ён усё роўна становіцца разумовым інвалідам. Цяжкія металы ўваходзяць у абавязковы пералік нашых даследаванняў, таму прайсці незаўважаным такое атручэнне не можа. Што датычыцца наўмыснага атручэння мыш'яком — пасля таго, як стала зразумела, што факт атручэння гэтым ядам лёгка ўстанавіць, ён перастаў разглядацца злачынцамі ў якасці сродку для забойства. Больш за тое, сёння нашы метады дазваляюць устанавіць нават нязначнае павышэнне фону мыш'яку ў мачы чалавека, калі той, напрыклад, з'еў напярэдадні морапрадукты. Такой дасканалай стала лабараторная дыягнастыка.



Юрый СІНЬКЕВІЧ: «Гэта абсталяванне дазваляе нам ідэнтыфікаваць лекавыя, наркатычныя і псіхатропныя рэчывы».

### ШАМПАНСКАЕ З ТАЛІЕМ

— У маёй практыцы быў кур'ёзны выпадак, — расказвае Людміла Сомава. — У двух суседак склаліся няпростыя ўзаемаадносіны, і адна другую вырашыла пачаставаць блінчыкамі з ртуццю. Высыпала ртутныя шарыкі з медыцынскага тэрмометра ў цеста. Але тая іх заўважыла і прынесла свой пачастунак да нас. Усе засталіся жывыя. Справа ў тым, што, трапіўшы ў страўнік, ртуць праходзіць па арганізме, так бы мовіць, транзітам і нідзе ў ім не адсарбіруецца. А небяспечная яна, найперш, пры ўдыханні. Прычым ртуць выпараецца нават пры пакаёвай тэмпературы, а патэльня, на якой смажыліся блінчыкі, толькі ўзмацніла выпарванне ртутных пароў. Атрымліваецца, што жанчына, якая спрабавала адпомсціць суседцы, нашкодзіла, у першую чаргу, сабе, а не сваёй саперніцы.

Дарэчы, адна з самых гучных «спраў атручвальнікаў» адбылася ў Мінску ў пачатку 1980-х гадоў: тады тры чалавекі загінулі і яшчэ некалькі сталі інвалідамі. Было ўстаноўлена, што злачынца дабавіў у бутэлькі з ліманадам і шампанскім талій, а ў віно — саляную кіслату і мыш'як. Усяго былі тры спробы, але кожны раз ахвярамі станавіліся выпадковыя людзі, а не той чалавек, якому прызначалася атрута. Пазней высветлілася, што такім чынам пакрыўджаны рабочы сцэны спрабаваў, як ён лічыў, аднавіць справядлівасць і пакараць свайго крыўдзіцеля...

— У чым сіла судова-хімічнай лабараторыі? Гэта не прабірачны метад, як у Шэрлака Холмса... Мы бачым не толькі таксічныя дозы, але і тэрапеўтычны фон — што чалавек прымаў у лячэбных мэтах учора, пазаўчора, — падкрэслівае Людміла Сомава. — Чалавечая думка пастаянна развіваецца, як, між іншым, і крымінальная. Таму трэба працаваць на апярэджанне, выпрацоўваць і колькасныя, і якасныя метады для новых рэчываў, якія будуць трапляць на наш рынак.

— Як я ўжо казаў, з 10 тысяч хімічных спалучэнняў мы даследуем толькі каля трох працэнтаў, таму час ад часу сутыкаемся з новым рэчывам, і тады наша работа ўскладняецца ў разы. А заключэнне эксперта можа скласці ўжо не 5—10, а 20, і нават, 30 машынапісных старонак, таму што даводзіцца праводзіць параўнальныя даследаванні, выпрацоўваць новы алгарытм. Затое, другі раз нам такія намаганні ўжо не спатрэбяцца, — падтрымлівае калегу начальнік упраўлення. — Увогуле, экспертыза з унутранымі органамі лічыцца вельмі складанай і такіх экспертыз на аднаго спецыяліста прыпадае ў год каля 30.

З'яўленне на нашым рынку новых псіхатропных рэчываў, так званых спайсаў, таксама дадало работы. Моцнай дапамогай стала створаная сумесна хімікамі і IT-кампаніяй «БелХард» праграма «Антынаркотыкі». Гэта база пастаянна актуалізуецца, у яе дабаўляюцца не толькі новыя рэчывы, але і метабаліты (прадукты распаду), якія застаюцца ў арганізме пасля спажывання спайсаў. Таму рэчыва яшчэ не трапіла на наш рынак, а мы ўжо ведаем, як яно будзе паводзіць сябе ў арганізме, і што нам трэба шукаць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@mail.ru*

**У цэнтральным апараце Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз працуюць 10 медыцынскіх судовых экспертаў-хімікаў. А ўсяго па краіне іх 75. Гэта няшмат, улічваючы статыстыку гвалтоўных смерцяў. Да таго ж медыцынскія судовыя эксперты-хімікі займаюцца таксама электраметкамі (маецца на ўвазе гібель людзей ад паражэння токам), агнястрэльнымі і колата-рэзанымі раненнямі. Любыя прадметы, якімі была нанесена траўма, пакідаюць свае сляды. Ад той жа кулі застаюцца на скураных покрывах сляды металізацыі, па якіх можна ўстанавіць, з якога матэрыялу яна была зроблена, якім чынам быў здзейснены выстрал. У параўнанні з 1990-мі гадамі колькасць экспертыз агнястрэльных раненняў у краіне зменшылася ў разы, а вось выпадкі агнястрэльных раненняў жывёл, наадварот, пачасціліся.**

# ЯК ПЧОЛЫ АБАРАНЯЛІ ЗАМКІ,

## або Насякомыя на вайне супраць людзей

**Як наконт арміі, якую нельга палічыць і ацаніць звыклымі метадамі? Ці павераце вы ў тое, што камарыны ўкус не выпадковы, а ненавісны ўсімі беларусамі каларадскі жук з'явіўся на бульбяных кустах па загадзе ваеннага начальства? Пра гэтыя таямнічыя падзеі і з'явы праведаў даследаванні часопіс «Мая Планета».**

Энтамалагічная зброя (як від біялагічнай зброі, які выкарыстоўвае насякомых для атакі ворага) хоць і забаронена на ўзроўні міжнародных канвенцый, але, як паказвае практыка, цалкам сабе дзейсная і небяспечная. А гісторыя яе вылічаецца стагоддзямі. Гэтыя хваробы ледзь не сцерлі чалавецтва з зямнога шара. Калі б Пётр Чайкоўскі не выпіў некіпячонай вады, унук Пятра І не захварэў воспай, а Антон Чэхаў змог бы зрабіць прышчэпку ад туберкулёзу, свет быў бы іншым. Многія даследчыкі настойваюць, што першая прылада такога роду была выкарыстана пры імператары Септымії Северы падчас вайны Рыма з Месапатаміяй. Крэпасць Хатрой адбіла чарговую атаку рымскіх легіянераў, скідваючы на іх зверху... што б вы думалі? Скарпіёнаў!

### Не толькі мёд



Выкарыстанне пчол і вос супраць ворага, як мяркуюць энтамолагі, мела месца яшчэ ў каменным веку. Дзейнічаў такі механізм элементарна. У пячору, дзе, як меркавалася, хаваўся праціўнік, закідвалі гудучыя раі, каб выманіць непрыяцеля са сховішча і адначасова нанесці яму калецтвы.

Нямала прыкладаў пчалінай дапамогі ў ваенным супрацьстаянні захавалася з часоў Сярэднявечча. Так, напрыклад, у 908 годзе англійскі горад Чэстэр быў абаронены ад вікінгаў дзякуючы таму, што англічане кідалі



**Бітва наёмнай арміі Мансфельд і войскаў Каталіцкай лігі пад Цаблатам у час Трыццацігадовай вайны (1618—1648).**

пчаліныя вуллі ў падземны ход, па якім спрабавалі прабрацца ворагі. У перыяд Трыццацігадовай вайны (1618—1648) нямецкі горад Кісенген быў аблажаны шведамі. Пітэр Хейл, адзін з жыхароў, прапанаваў скідаць на захопнікаў пчаліныя вуллі. Воінаў пчолы не вельмі турбавалі, але вось коней пакусалі, чым аслабілі шведскую армію. Такім чынам, метад спрацаваў, аблога скончылася. А ў горадзе адна з вуліц была названая ў гонар здагадлівага абаронцы. Аб сапраўднасці гэтай гісторыі сведчыць афіцыйны гарадскі партал сучаснага Бад-Кісінгена.

У Англіі, Шатландыі і Уэльсе пайшлі яшчэ далей. Замест таго каб выкарыстоўваць збаны з пчоламі аднаразова, кінуўшы іх у ворага, яны палічылі за лепшае пасяліць пчол у мурах, зрабіўшы для іх сярод камянёў спецыяльныя нішы і забяспечыўшы такім чынам дадатковую абарону ад тых, хто нападаў. Гэты метад не раз спрацоўваў, і патрывожаныя падчас нападу насякомыя накідваліся на крыўдзіцеляў. Адзіным мінусам, як высветлілася, была магчымасць сяліць пчол толькі з паўднёвага боку будынкаў.

Нігерыйскія плямёны ціў выкарыстоўваюць пчол супраць ворагаў і цяпер — на свой, не зусім бяспечны лад. Яны папросту запускаюць крылатых у трубку і дзьмуць з аднаго краю, накіроўваючы такім чынам джалячую зброю на ворага. Досыць сучасны ўспамін аб выкарыстанні пчол у якасці зброі захаваўся з часоў супрацьстаяння паміж Італіяй і Эфіопіяй ў 1935—1936 гадах, калі эфіопскія партызаны закідвалі пчаліныя вуллі ў танкі ворагу.

### Чума скача па Еўропе



**Блыха пад мікраскопам.**

Але не толькі пчолы праславіліся на вайне. Амерыканскі энтамолаг Джэфры Локвуд у сваёй кнізе «Шасціногія салдаты» расказвае, як падчас аблогі старажытнага горада Кафа (тэрыторыя сучаснай Феадосіі) ханам Джанібекам у 1346 годзе татарскае войска стала вымірац ад таямнічай хваробы (гэта была вядомая нам чума). Джанібек загадаў катапультамі перакідваць трупы за вароты горада генуэзцаў. Разам з трупамі ў горад пранiклі сапраўдныя пераносчыкі хваробы — блохі, якія з Феадосіі на судах уцекачоў-генуэзцаў затым трапілі ў Еўропу. Так пачалася пандэмія чумы (чорнай смерці), якая забрала тады, па розных звестках, да паловы еўрапейскага насельніцтва.

Паўтарыць вопыт з чумнымі блохамі ўзяліся японцы падчас Другой сусветнай вайны. Для распрацовак такога роду зброі быў створаны спецаддзел — «Атрад 731» пад кіраўніцтвам генерала Сіра Ісіі. План быў такі: блохі — пераносчыкі чумы, змешчаныя ў «бомбы» і скінутыя над тэрыторыяй праціўніка, павінны былі заразіць чумнай заразай непрыяцеля. Паўсталі складанасці з транспарціроўкай блох, якія гінулі пры высокіх тэмпературах выбухаў падрыхтаваных бомбаў. У рэшце рэшт быў распрацаваны адмысловы від керамічных бомбаў, і іх выбух адбываўся на гранічнай блізкасці да зямлі. Каля 30 000 заражаных асобін змяшчалася ў кожным зарадзе. Выпрабаванні актыўна праводзіліся на пляцоўках, дзе да слупоў прывязваліся палонныя салдаты і на іх правяралася магчымасць заражэння. Вядома, што чумных блох японцы планавалі задзейнічаць у 1944 годзе на Марыянскіх астравах, захопленых да таго часу амерыканскімі войскамі. Але падводная лодка ЗША патапіла японскае судна. Пазней, пасля наступлення войскаў СССР у Манчжурыі, спецатрад быў ліквідаваны, а ў ваколіцах успыхнула чума.



**Карціна «Трыумф смерці» Пітэра Брэйгеля Старэйшага адлюстроўвае наступствы пандэміі чумы. 1562 год.**

Аднак, былы камандзір Сіра Ісіі працягнуў сваю дзейнасць па распрацоўцы энтамалагічнай зброі, але ўжо ў ЗША. Вядома, што ў пасляваенных 50-я гады праводзіліся выпрабаванні, падобныя да японскіх, дзе выкарыстоўваліся жывыя блохі і камары для напаўнення бомбаў. Заразіць ворагаў амерыканцы збіраліся ўжо не чумой, а жоўтай ліхаманкай. Меркавалася, што распаўсюджанне захворвання будзе асабліва эфектыўнае на тэрыторыі СССР, дзе адсутнічалі якія-небудзь прышчэпкі і распрацаваныя прэпараты для лячэння гэтай хваробы. На шчасце, далей палігонных выпрабаванняў справа не пайшла.

### Гудзе і заражае



**Малярыйны камар.**

А вось выкарыстанне камароў — пераносчыкаў малярыі нямецкімі войскамі ў Італіі паказала сваю практычную эфектыўнасць у ваенныя гады. Германія, спрабуючы спыніць увярванне саюзнікаў на італьянскія землі, вырашыла выкарыстоўваць свае лабараторныя распрацоўкі па заражэнні ворага малярыяй. На думку прафесара Ельскага ўніверсітэта Фрэнка Соўдэна, гэта быў адзіны выпадак прымянення энтамалагічнай зброі ў Другой сусветнай вайне. У сваёй працы «Заваяванне малярыяй Італіі» Соўдэн расказвае, што восенню 1943 года немцамі былі затопленыя асушаныя раней балоты на поўдзень ад Рыма. Туды ж былі запушчаны лічынкі камароў, якія пераносілі малярыю, — Anopheles labranchiae.



**Так нацысцкія навукоўцы праводзілі даследаванні па заражэнні паддоследных малярыяй.**

Кіраваў аперацыяй нямецкі энтамолаг Эрых Марціні. 1217 выпадкаў захворвання сярод 245 000 чалавек было зафіксавана ў 1943 годзе і амаль 55 000 у 1944 годзе — такія дадзеныя афіцыйнай статыстыкі. Але сваёй мэты немцы пры гэтым не дасягнулі: брытанскіх і амерыканскіх салдат, якія прымалі антымалярыйныя прэпараты, захворванне абышло бокам.

### Жук-заваёўнік



Варта заўважыць, што казуркі не заўсёды служаць для прамога паражэння праціўніка. Існуе і апасродкаваны метад выкарыстання насякомых у якасці энтамалагічнай зброі, напрыклад для нанясення эканамічнага ўрону. Тут галоўным героем выступае ўсім вядомы каларадскі жук, здольны масава знішчаць сельскагаспадарчыя пасевы. Упершыню гэтае пытанне




**Скаўты дапамагаюць фермерам у барацьбе з каларадскімі жукамі ў графстве Тыльберы, Англія, 1949 год.**

было закранута Англіяй, якая абвінаваціла ў 1943 годзе Германію ў закідванні каларадскага жука на палі вострава Уайт. І хоць жукоў не знайшлі, лісты бульбы ўсё ж былі пашкоджаныя. Але асноўным абвінавачаным у справе па распаўсюджванні каларадаў былі ЗША. Урады Чэхаславакіі, Польшчы, ГДР і нават Кубы неадназова абвінавачвалі амерыканцаў у аграшкодніцтве. У Савецкім Саюзе гэта тэма таксама была паднятая і, нават, актыўна абмяркоўвалася ў прэсе. Але ўсё ж ніякіх прамых доказаў амерыканскага следу ў гісторыі з распаўсюджваннем паласатага шкодніка няма.

### Наступныя — кібаргі



**Жук-кібарг можа абыходзіцца без падзарадкі на працягу цэлага дня.**

Сучасная навука адышла ў бок ад былых эксперыментаў у галіне выкарыстання насякомых на вайне і цяпер цалкам засяроджаная вакол стварэння новага пакалення хітынавых кібаргаў. Так, гэта ўжо далёка не фантастычны сюжэт, а цалкам рэальныя навуковыя распрацоўкі. Далей за ўсіх у гэтай справе прасунуліся навукоўцы з Каліфарнійскага ўніверсітэта (Берклі) і Наньянскага тэхналагічнага ўніверсітэта (Сінгапур). Выкарыстоўваючы электроды і прымацаваўшы на спіну жукам электронныя мікраскрыні, ім удалося кіраваць палётам насякомага, адаючы каманды на адлегласці. Сістэма не кіруе кожным рухам, але можа прымусіць жука ўзляцець, павярнуць і перасоўвацца з неабходнай хуткасцю. Уздзеянне з дапамогай электродаў адбываецца на лапкі, мышцы і пэўныя долі мозга казуркі. А зараду батарэйкі, размешчанай на спіне, можа хапіць на цэлы дзень, што з'яўляецца безумоўнай перава-



**З дапамогай сістэмы кіравання жуком можна прымусіць яго ўзляцець, павярнуць і рухацца з неабходнай хуткасцю.**

гай у параўнанні з класічнымі беспілотнікамі. Такія кіраваныя казуркі могуць удзельнічаць у пошукава-выратавальных аперацыях і, магчыма, выкарыстоўвацца для разведкі і сачэння. Пакуль паспяховыя доследы праводзіліся толькі ў закрытых памяшканнях. А нам застаецца гадаць, куды ж могуць прывесці наш свет распрацоўкі насякомых-кібаргаў.

**Іван КУПАРВАС.** *hvir@zviazda.by*


## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества** | Лот №1. Капитальное строение инв. №235/С-6077, площадь – 1803,4 кв. м, наименование – «Базовая школа», расположенное по адресу: Витебская область, Чашникский район, Лукомльский с/с, д. Стражевичи, д. 2А, стоимостью 45360,00 рублей. Лот №2. Сооружение, специализированное водохозяйственного назначения инв. №235/С-6863, протяженностью 181,5 м, наименование «Канализационная сеть», расположенное по адресу: Витебская область, Чашникский район, Лукомльский с/с, д. Стражевичи, д. 2А, стоимостью 4032,00 рубля. Лот №3. Сооружение, специализированное энергетики инв. №235/С-6864, протяженностью 109,4 м, наименование «Сеть электроснабжения», расположенное по адресу: Витебская область, Чашникский район, Лукомльский с/с, д. Стражевичи, д. 2А, стоимостью 304,00 рубля |
| **Собственник (владелец) имущества** | Козлов Дмитрий Иванович |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Новолукомль, ул. Энергетиков, 15, (отдел принудительного исполнения Чашникского района) 26 мая 2017 года в 11.00 |
| **Справочная информация** | Отдел принудительного исполнения Чашникского района, 211162, г. Новолукомль, ул. Энергетиков, 15 Судебный исполнитель – Алейник Татьяна Ивановна, тел. 80213369093 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет Главного управления юстиции Витебского облисполкома (отдел принудительного исполнения Чашникского района) №3642903002109 в ЦБУ №222 филиала №215 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 647, УНП 300002505, не позднее 10.00 23.05.2017 года. Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии со ст. 516 ГПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «СТРОЙКОМПЛЕКС»

| Предмет торгов | Начальная цена | Размер задатка |
|---|---|---|
| Изолированное помещение (инв. №100/D-128334) – двухкомнатная квартира, пл. 56,6 кв. м, расположенная по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Фомина, 12-9 | 70 900,00 рублей | 1560,00 рублей |

| | |
|---|---|
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Организатор торгов** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | 3012178938017 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, код 369, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, УНП 201028245 |

Аукцион состоится **25 мая 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**
Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81, 8-(029) 626-72-52
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**
**Последний день приема заявлений – 24 мая 2017г. до 17.00**

■ Культура без меж



# МОВА АД БЕЛАРУСКІХ ЛЯЛЕК...

## У ПЕРАКЛАДЗЕ НЕ МАЕ ПАТРЭБЫ

**16 гадзін ехалі да Віцебска тамбоўскія артысты, каб павіншаваць з днём нараджэння Беларускі тэатр «Лялька». Госці падкрэслілі, што ў нашых майстроў сцэны ёсць чаму навучыцца.**

Першы спектакль «Дзед і Жораў» віцебскі тэатр паказаў у красавіку 1986 года. І гэта традыцыйная нагода для святкавання. Штогод у «Ляльцы» «на імяніны» адбываюцца міжнародныя міні-фестывалі.

Расійскія госці паказалі спектакль «Старая, старая казка». Рэжысёр — народны артыст Расійскай Федэрацыі Станіслаў Жалезкін. Ён даўні сябра «Лялькі». Пастаноўка пра сямейнае жыццё, як і жыццё наогул. Акцёры з дапамогай лялек расказваюць, што канфлікты, праблемы трэба вырашаць у пошуках ладу і згоды.

Цікава, што ў Тамбове лялечны і драматычны тэатры аб'яднаныя ў абласную дзяржаўную аўтаномную ўстанову культуры. Драматычны — адзін з найстарэйшых у Расіі правінцыйных тэатраў. Першыя гады існавання звязаныя з імем вядомага на ўвесь свет паэта і грамадскага дзеяча канца XVIII стагоддзя Г.Р. Дзяржавіна.

— Мы не першы раз у Беларусі. Заўсёды прыязджаем з вялікім задавальненнем. Акрамя Віцебска, выступалі ў Гомелі, мінскім тэатры імя Горкага... Шмат ездзім па прасторах былога СССР. Нашы спектаклі ўбачылі ў Казахстане. Раней шмат гастралявалі па Украіне. У Расіі былі ў розных гарадах, напрыклад у Астрахані, Калінінградзе... У нас ужо два разы прайшлі міжнародныя лялечныя фестывалі. Вашы артысты, спектаклі заўсёды прыемна здзіўляюць. І падчас гастроляў беларусаў нашы гледачы разумеюць іх без перакладу. Нават падчас параўнальна складаных пастановак, — расказвае **Пётр Кулікоў, дырэктар «Тамбоўтэатра»**.

Дадаў, што ёсць вялікае жаданне запрасіць мастацкага кіраўніка «Лялькі» Віктара Клімчука, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь, паставіць у Тамбове спектакль.

Асабліва цікавыя расіянам нашы спектаклі з выкарыстаннем марыянетак.

— Нельга сказаць, што ў Расіі гэта экзотыка. Але там усяго ў некалькіх тэатрах працуюць з гэтым тыпам лялек. А ўсё таму, што складана кіраваць марыянеткамі. Трэба доўга працаваць з кожнай лялькай. Неабходна вывучаць яшчэ і магчымасці, закладзеныя мастаком у механіку. У прыватнасці, якія рухі яна можа рабіць. Гэта самы складаны тып лялек, які патрабуе найвышэйшага майстэрства ад акцёра. Вопыт прыходзіць з часам. Апошняга не ва ўсіх хапае, ды і жадання.... І ў Беларусі не ва ўсіх тэатрах яны выкарыстоўваюцца, — дзеліцца **дырэктар «Лялькі» Аляксандр Грыгор'еў.**

Гаспадары свята паказалі спектаклі для дзятвы і дарослых. У фае праводзілі майстар-класы па вырабе сувеніраў. Усе ахвотныя маглі адчуць сабе ў ролі артыстаў. На свята запрасілі клуб гістарычнай рэканструкцыі, майстроў «паказваць трукі» з агнём, аніматараў, дзіцячыя самадзейныя калектывы...



Рашэннем адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Віцебска назва калектыву Беларускага тэатра «Лялька», а таксама імя артыста Сяргея Талкача занесеныя на раённую дошку Гонару.

Падчас міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» тэатр стане «сталіцай» праекта «Лялечны квартал». Як паабяцалі ў дырэкцыі, геаграфія краін-удзельніц пашырыцца. І, як заўсёды, не будзе свабодных месцаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

■ Выстаўка

# КУДЫ ПРЫЙСЦІ ПА АГЛЯД РЭЧАІСНАСЦІ

## Найлепшыя фотажурналісты свету ў адмысловай выставе ў Мінску

**Гэты фотаздымак абляцеў увесь свет. 22-гадовы турэцкі паліцэйскі Меўлют Мерт Алтынташ крычыць пасля забойства расійскага пасла ў Турцыі Андрэя Карлава на адкрыцці фотавыставы «Расія вачыма туркаў», а забіты мужчына ляжыць побач. Фатограф Associated Press Бурхан Азбіліджы, які, дарэчы, не збіраўся наведваць мерапрыемства і трапіў сюды амаль выпадкова, у гэтых небяспечных умовах узяў фотаапарат і пачаў працаваць. Серыя здымкаў, якую ён зрабіў, стала ашаламляльнай ілюстрацыяй для гучнай навіны, а ў выніку — пераможцам найпрэстыжнейшага міжнароднага конкурсу фотажурналістаў World Press Photo, то-бок «Сусветным прэс-фота года». Вынікі конкурсу, ужо 60-га, былі падведзеныя ў Амстэрдаме ў лютым, а 4 мая ў мінскім ЦЭХу пачала працаваць выстава, што прэзентуе пераможцаў і цэлы мінулы год.**



Фота Надзеі БУЖАН.

45 фатографаў з 25 краін — гэта выбранае з 80 408 работ 5034 аўтараў са 126 краін. На конкурс падавалі свае заяўкі і 19 удзельнікаў з Беларусі, але пакуль ніхто з іх не аказаўся адзначаным. Незалежная арганізацыя World Press Photo, створаная ў 1955 годзе, падтрымлівае прафесійную фотажурналістыку і прысуджае найпрэстыжнейшую ў сваёй сферы ўзнагароду, але, што больш цікава для звычайнага гледача, яна арганізуе штогадовую выставу па выніках конкурсу, якая вандруе па свеце і вяртае нас у мінулы год і паказвае свет у яго разнастайнасці і нечаканых праявах. У тым, што гэтая экспазіцыя здольная даць гледачу, — яна беспрэцэдэнтная. Пэўны актуальны агляд, зрэз апошняга часу, вобразы з розных куткоў свету, а таксама, што важна, — спалучэнне значнасці тэмы і мастацтва фатаграфіі, прафесіяналізму.

Часткова гэта адкрыцці, часткова — адлюстраванне таго, што хвалявала і хвалюе ўвесь свет. Летась, напрыклад, (выстава World Press Photo таксама праходзіла ў Беларусі) пэўным «лідарам» у цікавасці прэс-фатографаў прадказальна аказалася тэма бежанцаў, і пераможцам быў здымак «Надзея на новае жыццё» аўстралійскага фатографа Уорэна Рычардсана, які паказаў момант перадачы сірыйскага дзіцяці цераз калючы дрот на венгерска-сербскай мяжы. Сёлета з шырока абмяркоўваемых актуальнасцяў, не кажучы ўжо пра фота забойцы расійскага пасла ў Турцыі, на выставе знойдзецца выява Аішы Эванс, што стаіць перад мужчынамі ў форме на мітынгу супраць паліцэйскага гвалту ў дачыненні да чарнаскурых у ЗША; Куба пасля смерці Фідэля Кастра; чорны насарог, што быў знойдзены забітым браканьерамі дзеля каштоўнай здабычы — рога; наступствы выбуху бомбы ў пакістанскім горадзе; перапоўнены бежанцамі, якія спадзяюцца трапіць у Італію цераз Міжземнае мора, трум лодкі і так далей.

Узнагароды World Press Photo прысуджаюцца ў намінацыях «Экстранныя навіны», «Актуальныя тэмы», «Агульныя навіны», «Працяглыя праекты», «Штодзённасць», «Людзі», «Прырода» і «Спорт». У катэгорыі экстранных навін сёлета можна ўбачыць фота сірыйскіх дзяцей пасля артылерыйскіх абстрэлаў і цэлы рэпартаж пра эвакуацыю паселішча блізу Алепа пасля авіяўдараў; здымак, зроблены падчас бітвы за Масул у Іраку; тут жа бежанцы, забойствы, тэракты.

Калі гэта выглядае змрочна і жудасна (ну такі парадак дня), то крыху гратэскная серыя здымкаў абыходжання з пандамі ў Кітаі ўраўнаважыць цяжкія ўражанні. Не так даўно пандаў выключалі з катэгорыі віду, што знікае, і яны аказаліся проста «пад пагрозай», але ў Кітаі гэтыя жывёлы ўсё роўна ўвесь час знаходзяцца пад наглядам чалавека. Цікавым фотапраектам стала серыя здымкаў з невялікага заснежанага паселішча каля ракі Ніжняя Тунгуска на Крайняй Поўначы Расіі, дзе жыве каля ста чалавек, а найбліжэйшы горад знаходзіцца за трыста кіламетраў.

Шыкоўнай, хоць і цяжкай, атрымалася серыя здымкаў з Філіпін, дзе вядзецца актыўная барацьба ўрада на чале з новым прэзідэнтам Радрыга Дутэртэ з распаўсюджваннем наркотыкаў. У выніку, па звестках міжнароднай арганізацыі Amnesty International, тут павялічылася колькасць пазасудовых забойстваў, і за кароткі тэрмін паліцыяй і невядомымі ўзброенымі людзьмі было забіта 7025 чалавек. Даведацца пра гэта і шмат іншых з'яў, куткоў і тэндэнцый, што маюць месца дзе б там ні было ў свеце, можна на выставе World Press Photo.

Экспазіцыя, у якой вельмі своеасаблівым спосабам адкрываецца 2016 год, стала даступнай для наведвання 4 мая і будзе працаваць да 24-га.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*




■ «Еўрабачанне-2017»

# НА КРЫЛАХ ПЕСНІ

## Беларусы выйшлі ў фінал міжнароднага музычнага конкурсу

**Сёння ў Кіеве пройдзе фінал маштабнага песеннага шоу «Еўрабачанне». Што асабліва прыемна, падчас грандыёзнага канцэрта мы, як і мільёны іншых гледачоў па ўсім свеце, зноў убачым нашых удзельнікаў і ўпершыню на «Еўрабачанні» пачуем беларускую мову.**

Другое паўфінальнае шоу, у якім выступалі беларусы, завяршылася ў ноч з чацвярга на пятніцу. Калі нашу краіну назвалі ў ліку першых шчасліўцаў з топ-10, у многіх напэўна адлягло ад сэрца: усё ж адна справа — верыць і спадзявацца на поспех, а другая — дакладна ведаць, што пасля двух гадоў няўдач задача-мінімум выкананая, і свята на нашай вуліцы працягваецца. «Гэта неверагодна! Дзякуй кожнаму з вас за падтрымку!» — напісалі артысты на сваёй старонцы ў сацсетках ці не адразу пасля абвяшчэння вынікаў. Наогул, мяркуючы па водгуках у сусветным павуцінні, нашых артыстаў падтрымлівалі землякі і проста прыхільнікі з Украіны, Расіі, Польшчы, Літвы, Чэхіі, Румыніі, Нарвегіі, ЗША і нават Катара.

Ад усяго сэрца віншуем «NaviBand» і зычым ім удачы ў фінале! Дарэчы, паводле лёсавання, якое адбылося ўчора, беларусы з песняй «Гісторыя майго жыцця» выйдуць на сцэну пад нумарам 3. Разам з імі барацьбу за галоўны прыз працягнуць канкурсанты з Балгарыі, Венгрыі, Харватыі, Даніі, Ізраіля, Румыніі, Нарвегіі, Нідэрландаў і Аўстрыі. Усяго ж, нагадаем, у фінальным канцэрце выступяць удзельнікі з 26 краін; адкрые гранд-шоу прадстаўнік Ізраіля, а завершыць — спявачка з Францыі Альма.

Букмекеры, якія апошнія некалькі гадоў загадзя прадказваюць пераможцу «Еўрабачання», дагэтуль робяць самыя высокія стаўкі на запіснога фаварыта сёлетняга конкурсу, прадстаўніка Італіі — пераможцу Сан-Рэма Франчэска Габані, які са сваёй песняй-памфлетам «Occidentali's Karma» («Карма на заходні манер») і чорнай малпай літаральна ўзарваў еўрапейскія чарты і набраў на YouTube звыш 110 мільёнаў праглядаў. Другім найбольш імаверным прэтэндэнтам на перамогу называюць прадстаўніка Партугаліі Сальвадора Сабрала: хворы на сэрца артыст сваёй лірычнай баладай на роднай мове «Amar Pelos Dois» парадаваў вуха музычных эстэтаў і, на думку многіх крытыкаў, прадставіў самую пяшчотную і прыгожую песню на конкурсе гэтага года. Замыкае тройку лідараў прадстаўнік Балгарыі Крысціян Костаў — самы юны ўдзельнік «Еўрабачання-2017» відавочна скарыў энергетыкай і крыху змрочным абаяннем сэрцы дзявочай аўдыторыі. Таксама ў першую дзясятку, паводле прагнозаў букмекераў, трапяць артысты з Бельгіі, Швецыі, Арменіі, Румыніі, Францыі, Вялікабрытаніі і Азербайджана. Зрэшты, настроены на барацьбу і іспанскі спявак-гітарыст Манэль Навада Кесара са сваёй лёгкай «пляжнай» песенькай і сцэнічнымі доскамі для сёрфінга, і ўкраінскія рокеры з гурта O.Torvald, і прадстаўніца Германіі спявачка Levina, чый глыбокі хрыплаваты голас літаральна заварожвае...



Наколькі спраўдзяцца гэтыя прагнозы і нашы чаканні — даведаемся ўжо зусім хутка. Нагадаем, нацыянальныя журы ацэнкі ўжо выставілі, а сёння ўвечары галасуюць за сваіх улюбёнцаў гледачы з усіх 42 краін-удзельніц конкурсу. Балы ад беларусаў агучыць колішняя фіналістка «Еўрабачання» Алена Ланская. Пераможца «Еўрабачання», як і летась, вызначыцца па суме балаў суддзяў і публікі, таму інтрыга мусіць трымацца да апошняй хвіліны, а вынік — спадзяёмся — акажацца ўсё ж выбарам музычным, а не палітычным.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.** *tselyashuk@zviazda.by*

# ДРУГІ ПАСЛЯ РАХБАРА

## Чым скончацца прэзідэнцкія выбары ў Іране?

**Прэзідэнцкія выбары ў Іране адбудуцца менш чым праз тыдзень — 19 мая. Правам голасу валодаюць 55 мільёнаў грамадзян ісламскай рэспублікі. З 1636 кандыдатаў Наглядальным саветам Ірана да выбарчай кампаніі было допушчана толькі шэсць. А з іх, у сваю чаргу, як заўважаюць эксперты, найбольш рэальныя шанцы на перамогу ёсць у двух — цяперашняга прэзідэнта Хасана Раўхані і экс-генпракурора краіны Эбрахіма Раісі. Чым жа завершыцца іранская інтрыга?**




### АКТЫЎНЫ АРБІТР

У сістэме іранскай улады прэзідэнт — другая па значнасці службовая асоба. Ён з'яўляецца гарантам канстытуцыі і кіраўніком выканаўчай улады. Усе рашэнні па ключавых пытаннях прэзідэнт узгадняе з духоўным лідарам (рахбарам), якому належыць вярхоўная ўлада ў Ісламскай Рэспубліцы. Цяпер гэта аятала Алі Хаменеі, пераемнік заснавальніка Ісламскай Рэспублікі аяталы Хамейні. Вышэйшы кіраўнік, акрамя ўсяго іншага, — вярхоўны галоўнакамандуючы, якому напрамую падпарадкоўваецца Корпус вартавых ісламскай рэвалюцыі (КВІР). Пазіцыя вышэйшага кіраўніка хоць і палітычная, «але ў вялікай ступені гэта хутчэй вярхоўны арбітр, які выконвае правілы гульні ў некаторых вышэйшых інтарэсах, чым непасрэдна крытычны гулец», заўважаў кіраўнік расійскага Інстытута прыкладнога ўсходазнаўства і афрыканістыкі Саід Гафураў.

У Іране няма пасады прэм'ер-міністра, таму прэзідэнт фарміруе і каардынуе дзейнасць урада. Кандыдатуры на міністэрскія крэслы і пасады віцэ-прэзідэнтаў зацвярджае парламент. Асаблівае месца займаюць міністры разведкі і абароны, прызначэнне якіх таксама патрабуе адабрэння з боку рахбара. Прэзідэнта абіраюць на чатыры гады прамым усенародным галасаваннем. Ён не можа займаць пасаду больш за два тэрміны запар.

Працэдура выбараў прэзідэнта адрозніваецца ад прынятай у большасці краін свету. Штаб па правядзенні выбараў пры МУС Ірана рэгіструе ахвотных удзельнічаць у выбарах. Гэта адбылося і зараз, калі штаб па працягу пяці дзён рэгістраваў патэнцыйных кандыдатаў, і ў выніку ў спіс патрапілі 1636 чалавек — 1499 мужчын і 137 жанчын. Далей Наглядальны савет, у які ўваходзяць ісламскія прававеды і прадстаўнікі вышэйшага шыіцкага духавенства, разглядае кожную з гэтых кандыдатур і выбірае найбольш годных.

Алі Хаменеі «вельмі ўскосна аказвае ўплыў», у тым ліку і на выбары, тлумачыць Саід Гафураў. «Мэта яго — знаходжанне кампрамісу паміж палітычнымі сіламі, а не перамога кагосьці», — лічыць эксперт. «Гарантыі ў Іране на выбарах перамогі канкрэтнага чалавека не бывае, інтрыга заўсёды ідзе да самага канца», — заўважыў прэзідэнт расійскага Інстытута Блізкага Усходу Яўген Сатаноўскі.

Але да цяперашніх выбараў аятала праяўляе вельмі актыўную цікавасць. І, здаецца, гэтым разам арбітр дэманструе сімпатыі і антыпатыі. У сакавіку заходнія СМІ адзначалі, што Хаменеі з набліжэннем выбараў усё больш крытыкуе ўмеранага прэзідэнта Раўхані. У папрок яму ставілася тое, што пасля ядзернай здзелкі 2015 года эканоміка Ірана так і не адчула чаканага росту. Аятала Хаменеі хоць і ўхваліў здзелку з «шасцёркай», якую ўзначальваў Барак Абама, але выказваў асцярогі ў дачыненні да любога кроку да збліжэння з ЗША, называючы амерыканцаў «двудушнымі і зласлівымі».

Тое, што «адкрыццё Ірана свету» не прывяло да сур'ёзнага росту інвестыцый, было выкарыстана для крытыкі кансерватарамі — апанентамі цяперашняга прэзідэнта Ірана. Пазіцыі «сааўтара» ядзернай здзелкі Раўхані былі падарваныя і пасля абрання Дональда Трампа. Новы прэзідэнт ЗША мае намер разарваць пагадненне і дэманстратыўна робіць больш жорсткай палітыку Вашынгтона ў дачыненні да Тэгерана. Гэта пацвярджае высновы Хаменеі пра «двудушных і зласлівых амерыканцаў». «Раўхані зрабіў стаўку на Захад, яна часткова згулялася, часткова не», — адзначыў Саід Гафураў. Аятала не зрабіў стаўку і на ультракансерватара Ахмадзінежада. Як адзначалі эксперты, жорсткае супрацьстаянне з Захадам, якое вёў той, будучы прэзідэнтам, не адпавядае ўласна пазіцыі «рэжыму іранскіх аятол». Як растлумачыў Яўген Сатаноўскі, прыход у 2013 годзе ўмеранага Раўхані на змену радыкалу Ахмадзінежаду на справе прадэманстраваў менавіта гэта: «Стары рэлігійны істэблішмент сцісну брутальнае свецкае крыло КВІР, якое лічыла за лепшае дзейнічаць не рапірай, а дубінай і шмат што сапсавала».

А перад цяперашнімі выбарамі з Ахмадзінежадам «наогул не вельмі каракстна абыходзяцца, бо лічаць, што ён занадта непрымальны для некаторых заходніх партнёраў, і калі ён прыйдзе, то пачнецца вайна», — заўважае Саід Гафураў. Экс-прэзідэнт наогул не быў допушчаны да выбараў. Раней паведамлялася, што вярхоўны лідар Ірана не рэкамендаваў Ахмадзінежаду ісці на выбары.

### ІНТРЫГІ І ФАВАРЫТЫ

Перад майскімі выбарамі новага прэзідэнта Ірана вызначыўся фаварыт. Гэта, на думку Захаду, не цяперашні прэзідэнт Хасан Раўхані і не выкраслены аяталай з ліку кандыдатаў экс-прэзідэнт Махмуд Ахмадзінежад. Кансерватар Эбрахім Раісі, якому прадказваюць перамогу, не давярае ні Захаду, ні Расіі — і такое, на думку экспертаў, агульнае меркаванне іранскай эліты. На яго зрабілі стаўку сілавікі, у тым ліку Корпус вартавых ісламскай рэвалюцыі. Выразнік агульнага меркавання Эбрахім Раісі (якога Захад называе фаварытам гонкі) — стаўленік кансерватыўнага духавенства, тлумачыць Яўген Сатаноўскі. Тое, што ў яго добрыя адносіны з «вартавымі рэвалюцыі», вялікі плюс для гэтага кандыдата. Што датычыцца знешнепалітычных поглядаў Раісі, то ён пазбаўлены сімпатый да Захаду і насцярожана ставіцца да Расіі. «Ён кажа: «Расіяне не выканаюць, што абяцаюць, а Захад дакладна падмане», — гаворыць Саід Гафураў. — Гэтая пазіцыя ў Іране агульная». Эбрахім Раісі выказвае агульнакансерватыўны пункт гледжання. А ўсе прэтэндэнты, уключаючы Раісі, — кансерватыўнага кірунку, адзначае Яўген Сатаноўскі. «Памяркоўныя, празмерныя — гэта ўжо іншае пытанне. Але на сённяшні момант толькі кансерватары маюць шанцы прайсці на вышэйшыя пасады ў Іране», — дадаў эксперт.

Перамога Раісі над сапернікамі-кансерватарамі зусім не прадвызначаная. На думку Саіда Гафурава, нейкія апытанні, дзе кандыдата назвалі фаварытам, магчыма, і праводзяць, але яны могуць быць «часткай палітычных тэхналогій». Акрамя таго, у справу ўмешваецца не зусім палітычны фактар.



«Меркаванне вышэйшага кіраўніка Хаменеі, вядома, важна. Але Хаменеі цяпер надзвычай хворы», — адзначае Сатаноўскі. Шпіталізацыя іранскага лідара ў сакавіку 2015 года ўжо была нагодай для спекуляцый. Ужо тады абмяркоўвалася пытанне аб магчымым пераемніку рахбара і пра тое, ці будзе ён кансерватарам або рэфармістам. Калі Хаменеі сыдзе, то Раісі будзе адным з галоўных прэтэндэнтаў на пасаду рахбара, а не прэзідэнта, заўважае Яўген Сатаноўскі. «Усё можа памяняцца. Там не лінейная інтрыга», — адзначае эксперт.

### РЭФАРМАТАРЫ І КАНСЕРВАТАРЫ

Такой магутнай атакі на цяперашнюю адміністрацыю не было за ўсе чатыры гады яе дзейнасці. Кабінет міністраў жорстка папракаюць у няздольнасці вырашыць найбольш вострыя сацыяльныя і эканамічныя праблемы краіны, у прыватнасці знізіць беспрацоўе, падняць узровень жыцця насельніцтва. Рэфарматары ўсімі сіламі абараняюць Раўхані. Яны прызнаюць, што беспрацоўе ў Іране дасягнула рэкордных паказчыкаў (12% працаздольнага насельніцтва не маюць работы, у тым ліку больш за 20% моладзі), але ўтаймаваць інфляцыю ўраду ўдалося. Упершыню з пачатку стагоддзя яна абмяжоўвалася адназначнай лічбай на выніках мінулага года — 7,5% супраць ранейшых 25—30%.

З іншага боку, прыхільнікі Раўхані заўважаюць, што аднаго чатырохгадовага тэрміну для вываду краіны з крызісу, у які яна апынулася за восем гадоў прэзідэнцтва ультракансерватара Махмуда Ахмадзінежада, мала. Міжнародныя санкцыі, якія дзейнічалі да студзеня мінулага года ў дачыненні да Ірана, апусцілі эканоміку краіны да крытычна нізкай кропкі. Пасля адмены санкцыйнага рэжыму прайшоў толькі адзін год і чатыры месяцы, за гэты час немагчыма пераадолець усе наступствы эканамічнай ізаляцыі. Да таго ж ЗША, па словах прыхільнікаў дзейнага прэзідэнта, недобрасумленна выконваюць свае абавязацельствы па ядзерным пагадненні, што тармозіць нармалізацыю эканамічных адносін Ісламскай Рэспублікі з астатнім светам.

У сваю чаргу кансерватары ставяць пад сумнеў само ядзернае пагадненне — сумесны ўсёабдымны план дзеянняў, рэалізацыя якога пачалася ў студзені мінулага года адменай шматлікіх (але не ўсіх) антыіранскіх санкцый. На іх думку, у гэтым дакуменце не было ніякай неабходнасці і няма чаго адкрываць шлях у Іран замежным кампаніям. Нацыянальную эканоміку можна і трэба падымаць без староннай дапамогі, абапіраючыся на ўнутраныя рэсурсы, лічаць кандыдаты ад кансерватараў і іх прыхільнікі.

З шасці кандыдатаў аўтсайдарамі смела можна назваць двух былых міністраў — экс-міністра культуры і ісламскай арыентацыі Мастафа Ага Мірсаліма і экс-міністра прамысловасці Мастафа Хашэмі Таба. Такім чынам, кола прэтэндэнтаў, якія маюць рэальныя шанцы на перамогу, звужаецца да чатырох чалавек: Раўхані і Джахангіры — ад рэфарматараў, Раісі і Галібаф — ад кансерватараў. Лідарамі ў гэтых парах выступаюць Раўхані і Раісі.

Другія нумары, як меркавалася, могуць зняць свае кандыдатуры непасрэдна перад выбарамі, заклікаўшы прыхільнікаў аддаць галасы свайму больш уплывоваму напарніку. Аднак Джахангіры абверг наяўнасць такіх планаў. «Я сам хачу стаць прэзідэнтам», — заявіў першы віцэ-прэзідэнт журналістам з уласцівай яму шчырасцю.

Падобна, мае намер ісці да канца і Галібаф. У ходзе першага раўнда тэледэбатаў ён рашуча апаніраваў Раўхані. «Магчыма, абодва нашы кандыдаты будуць да канца прысутнічаць на сцэне», — заявіў агенцтву IRNA генеральны сакратар Ісламскага таварыства інжынераў Махамад Рэза Баханар. Аднак, заўважае шэраг экспертаў, Раўхані, нягледзячы на крытыку, якая гучыць у яго адрас, па-ранейшаму выглядае фаварытам прэзідэнцкай гонкі. Шмат хто ў Іране лічаць, што трэба даць яму яшчэ чатыры гады на рэалізацыю планаў і выкананне абяцанняў. Розныя арганізацыі праводзяць сацапытанні, але іх вынікі выглядаюць вельмі супярэчлівымі.

Наўрад ці хто-небудзь можа цяпер з поўнай упэўненасцю спрагназаваць канчатковыя вынікі. Шмат хто кажа пра верагоднасць другога тура, выказваюць сумненні ў тым, што ў першым туры адзін з шасці кандыдатаў набярэ патрэбныя для перамогі 50% плюс адзін голас. Як жа яно акажацца насамрэч, даведаемся ўжо зусім хутка.



**Захар БУРАК.**
*burak@zviazda.by*

Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | ОАО «Реммех», 220024, г. Минск, ул. Бабушкина, 48 Тел. +375 (17) 291-83-47 |

**Предмет аукциона**

**Транспорт, спецтехника и оборудование, расположенные по адресу:** г. Минск, ул. Бабушкина, 48, в составе:

| № лота | Инв. номер | Наименование | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | - | **Трактор Т-170Б** | 10 325,00 | 516,25 |
| 2 | 10024 | **Ножницы гильотинные НА 3225** | 15 156,12 | 757,81 |
| | 1112323 | **Тележка под гильотину с путями S32** | | |
| | 4194 | **Установка роликовая для резки** | | |
| 3 | 4211 | **Пресс-ножницы 3Н5222** | 2 261,70 | 113,09 |
| 4 | 5160 | **Сварочный полуавтомат JackleMIG 326 G** | 926,10 | 46,31 |
| 5 | 5158 | **Сварочный полуавтомат JackleMIG 500TS** | 1 102,50 | 55,13 |
| 6 | 999968 | **Полуавтомат Powertec 250C** | 355,32 | 17,77 |
| 7 | 999969 | **Полуавтомат Powertec 250C** | 355,32 | 17,77 |
| 8 | 1018 | **Полуавтомат Powertec 250C** | 426,30 | 21,32 |
| 9 | 10022 | **Полуавтомат Powertec 300** | 470,40 | 23,52 |
| 10 | 5077 | **Сверлильный станок 2Н135** | 790,44 | 39,52 |
| 11 | 4071 | **Станок токарно-винторезный 16 в-20** | 4 456,20 | 222,81 |
| 12 | 4035 | **Универсальный трубогибочный механизм ТГС-5** | 1 206,24 | 60,31 |
| 13 | 4591 | **Контейнер металлический, 2014 г. в.** | 186,00 | 9,30 |
| 14 | 41000001 | **Станок радиально-сверлильный 2Н55Ф2, 1971 г. в.** | 5 700,00 | 285,00 |
| 15 | 5169 | **Станок сверлильный 2М-118 (2Н 155), 1990 г. в.** | 564,00 | 28,20 |
| 16 | 70 | **Станок-автомат сеткоплетильный ВСА 97/15-50, 1998 г. в.** | 1 020,00 | 51,00 |
| 17 | 50 | **Станок заточной 3А64Д, 1972 г. в.** | 3 060,00 | 153,00 |
| 18 | 4032 | **Станок точильно-шлифовальный ТШ-3, 2006 г. в.** | 282,00 | 14,10 |
| 19 | 221 | **Станок универсально-заточной 3М-642, 1986 г. в.** | 3 180,00 | 159,00 |
| 20 | 10021211 | **Покрасочный агрегат GRACO-390, 2013 г. в.** | 426,00 | 21,30 |
| 21 | 4380 | **Обогреватель переносной Master BV 170 E** | 966,00 | 48,30 |

**Изолированные помещения** в составе:

| № лота | Инв. номер | Наименование (назначение) | Общая площадь | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| 22 | 500/D-708145927 | **Административное помещение** | 402,5 кв. м | г. Минск, ул. Бабушкина, 48-5 |
| | Начальная цена с НДС 20% – **149 082,00 белорусских рублей** (снижена на 50%) Шаг аукциона – **7 454,10 белорусских рублей** | | | |
| 23 | 500/D-708145924 | **Административное помещение** | 289,3 кв. м | г. Минск, ул. Бабушкина, 48-2 |
| | Начальная цена с НДС 20% – **82 200,00 белорусских рублей** (снижена на 50%) Шаг аукциона – **4 110,00 белорусских рублей** | | | |
| 24 | 500/D-708145928 | **Административное помещение** | 402,8 кв. м | г. Минск, ул. Бабушкина, 48-6 |
| | Начальная цена с НДС 20% – **107 400,00 белорусских рублей** (снижена на 50%) Шаг аукциона – **5 370,00 белорусских рублей** | | | |
| 25 | 500/D-708145929 | **Административное помещение** | 408,9 кв. м | г. Минск, ул. Бабушкина, 48-7 |
| | Начальная цена с НДС 20% – **110 400,00 белорусских рублей** (снижена на 50%) Шаг аукциона – **5 520,00 белорусских рублей** | | | |

**Ремонтно-механическая мастерская, оборудование и иное имущество, реализуемое одним лотом:**

| № лота | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентар-ный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| 26 | **Ремонтно-механическая мастерская** (помещение неустановленного назначения) | 3401,4 кв. м | 500/D-708182365 | г. Минск, ул. Бабушкина, 48/1-2 |

**С перечнем оборудования и иного имущества, входящего в состав лота,** можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by

**Начальная цена с НДС 20% – 1 162 094,81 белорусских рублей** (снижена на 30%)

**Шаг аукциона – 58 104,74 белорусских рублей**

| | |
|---|---|
| Обременения по лотам №№22–26 | Арендаторы. Подробная информация на сайте организатора аукциона |

С подробной информацией по предметам аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

| | |
|---|---|
| Порядок ознакомления | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется во вторник, среду и четверг с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Расолько Александр Александрович, главный энергетик, контактный телефон (МТС) 80295702184 |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с №3012343260010; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты: по лотам №№1–21** не более **10 (десяти) дней** со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**По лотам №№22–27** не более **30 (тридцати) дней** со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением СовМина РБ от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне представляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5%

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в г. «Звязда» 22.04.2017 г.

| | |
|---|---|
| Дата, место и время проведения аукциона | **30.05.2017** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Бабушкина, 48, актовый зал, ОАО «Реммех»** |
| Дата, место и время окончания приема документов | **26.05.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| Контактные телефоны | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего УО «Могилевский государственный ордена Трудового Красного Знамени профессиональный агролесотехнический колледж имени К. П. Орловского»**

**Лот №1. Трактор К-701, г. в. – 1988, гос. номер 3909 БЮ,** заводской номер 8802533, инв. №01300340; цвет ТС – желтый; колесная формула – 4х4; вид топлива – дизель; коробка передач – МКП; модель двигателя – ЯМЗ-240 БМ; мощность двигателя, кВт/л.с. – 220/300.

**Начальная цена продажи – 10 600,00 бел. руб. с учетом НДС; Сумма задатка – 1 060,00 бел. руб.**

| | |
|---|---|
| Продавец | УО «Могилевский государственный ордена Трудового Красного Знамени профессиональный агролесотехнический колледж имени К. П. Орловского», УНП 700147745, Могилевская обл, Могилевский р-н, а. г. Буйничи, ул. Орловского |
| Расчетный счет для перечисления задатка | Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, МФО 153001369 |
| Дата, время и место проведения аукциона | **Аукцион проводится 15 июня 2017 года в 14.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 99, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 14 июня 2017 года до 15.00 |
| Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества | В течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона с победителем заключается договор купли-продажи. Оплата производится в течение 3 (трех) рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи |

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); представившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: – юридические лица Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации, копии учредительных документов, копию документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; – индивидуальные предприниматели Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации и документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; – физ. лица – паспорт, представители физ. лиц и индивидуальных предпринимателей – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; – иностранные юридические лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; – иностранные индивидуальные предприниматели – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; – представители иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условие – наличие не менее 2 участников. Единственный участник имеет право приобрести объект по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, в соответствии со счетом-фактурой, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.

Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8-0222) 32-43-98, (8-0291) 400-394; (8-029) 624-26-25

Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | ОАО «НЕРУДПРОМ», г. Минск, ул. Асаналиева, 72 |

**Предмет аукциона**

| № лота | Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Квартира** | 40,8 кв. м | 600/D-89149 | Минский р-н, Ждановичский с/с, аг. Ждановичи, ул. Зеленая, 1В-99 |

Начальная цена лота №1 без НДС – **68 942 руб. 21 коп.** (снижена на 10%)

***Транспорт и спецтехника***

| № лота | Наименование | Инв. номер по бухучету |
|---|---|---|
| 2 | **Автомобиль МАЗ 500А, гос. номер КА 7474, г. в. – 1978** | 7474 |
| | Начальная цена лота №2 с НДС – **4 176 руб. 14 коп.** (снижена на 10%) | |
| 3 | **Трактор МТЗ-82Л, гос. номер 7485 ОА, г. в. – 1979** | 3585 |
| | Начальная цена лота №3 с НДС – **5 846 руб. 60 коп.** (снижена на 10%) | |
| | Месторасположение лотов №2 и №3 – Минский р-н, Петришковский с/с, р-н д. Захаричи, ДСЗ «Заславль» | |
| 4 | **Автомобиль МАЗ 55514 020, гос. номер KI 4543, г. в. – 2002** | 4345 |
| | Начальная цена лота №4 с НДС – **8 613 руб. 31 коп.** (снижена на 10%) | |
| 5 | **Автокран Краз 250, гос. номер 4186 МИН, г. в. – 1991** | 4186 |
| | Начальная цена лота №5 с НДС – **17 539 руб. 80 коп.** (снижена на 10%) | |
| | **Месторасположение лотов №4 и №5 - г. Минск, ул. Асаналиева, 72** | |
| 6 | **Трактор МТЗ-82 1, гос. номер КА-7 0409, г. в. – 2002** | 3993 |
| | Месторасположение лота №6 – Минский р-н, Петришковский с/с, д. Большая Воловщина, ПСХ «Колос» | |
| | Начальная цена лота №6 с НДС **– 12 185 руб. 80 коп.** (снижена на 10%) | |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010, в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещение затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорены в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано газете «Звязда» от 01.03.2017

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 25.05.2017 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703.

Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 24.05.2017 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029 317-95-42. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | ОАО «Реммех», 220024, г. Минск, ул. Бабушкина, 48 Тел. +375 (17) 291-83-47 |

**Предмет аукциона**

**Лот №1 – Здание котельной**

| Инв. номер | Наименование (назначение) | Общая площадь | Адрес |
|---|---|---|---|
| 500/С-23855 | **Здание котельной. Литер Б2/к-кп** (здание неустановленного назначения) | 812 кв. м | г. Минск, ул. Бабушкина, 48 |
| Сведения о земельном участке | Земельный участок предоставлен Продавцу на праве аренды (срок действия договора по 2049 г.) общ. пл. **0,3841 га** для эксплуатации и обслуживания здания неустановленного назначения | | |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **115 080,00 белорусских рублей** | | |
| **Шаг аукциона** | **5 754,00 белорусских рублей** | | |

**Лот №2 – Объекты недвижимости** в составе:

| Инв. номер | Наименование (назначение) | Общая площадь | Адрес |
|---|---|---|---|
| 500/С-27612 | **А 4/к-кп. Здание котельной** (здание специализированное энергетики) | 1758,0 кв. м | г. Минск, ул. Бабушкина, 48 |
| 500/С-47974 | **Станция для перекачки конденсата литер М1/К** (сооружение специализированное коммунального хозяйства) | 5,5 кв. м | г. Минск, ул. Бабушкина, 48 |
| Сведения о земельном участке | Земельный участок предоставлен Продавцу на праве аренды (срок действия договора по 2049 г.) с общ. пл. **1,1998 га для** эксплуатации и обслуживания здания специализированного энергетики (здание котельной) и здания неустановленного назначения (здание котельной) (установленные ограничения: охранная зона водопровода, площадь 0,1228 га, охранная зона газопровода, площадь 0,0650 га) | | |
| Обременение | Арендаторы. Подробная информация на сайте организатора аукциона | | |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **240 912,00 белорусских рублей** | | |
| **Шаг аукциона** | **12 045,60 белорусских рублей** | | |

**Лот №3 – Здание контрольно-пропускного пункта**:

| Инв. номер | Наименование (назначение) | Общая площадь | Адрес |
|---|---|---|---|
| 500/С-28266 | **Здание контрольно-пропускного пункта** (здание специализированное иного назначения) | 201 кв. м | г. Минск, ул. Бабушкина, 48 |
| Составные части и принадлежности | Ворота металлические откатные, ограждения (железобетонное, металлическое), площадки (асфальтобетонное, бетонное, плиточное покрытия), площадка под оборудование (бетонное покрытие) | | |
| Сведения о земельном участке | Земельный участок предоставлен Продавцу на праве аренды (срок действия договора по 2051 г.) с общ. пл. **0,7151 га для** эксплуатации и обслуживания административно-бытового здания, здания ФОКа, здания КПП, здания неустановленного назначения | | |
| Обременение | Арендаторы. Подробная информация на сайте организатора аукциона | | |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **136 011,60 белорусских рублей** | | |
| **Шаг аукциона** | **6 800,58 белорусских рублей** | | |

С подробной информацией по предметам аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

| | |
|---|---|
| Порядок ознакомления | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется во вторник, среду и четверг с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Расолько Александр Александрович, главный энергетик, контактный телефон (МТС) 80295702184 |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с №3012343260010; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более **30 (тридцати) дней** со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне представляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5%

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| Дата, место и время проведения аукциона | **14.06.2017** в 10.30 по адресу: **г. Минск, ул. Бабушкина, 48, актовый зал, ОАО «Реммех»** |
| Дата, место и время окончания приема документов | **12.06.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| Контактные телефоны | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

# ЯНУШКОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для обслуживания одноквартирных жилых домов 15.06.2017 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 10**

| № п/п | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка | Наименование инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Расходы по документации (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Хоружинцы, ул. Лесная, 16, кадастровый номер 623288016101000066 | 0,1285 га | | 2478 руб. 92 коп. | 495 руб. 78 коп. | 1317 руб. 02 коп. |
| 2 | д. Мочулище, ул. Полевая, 1 Б, кадастровый номер 623288010101000022 | 0,1599 га | | 1912 руб. 64 коп. | 382 руб. 53 коп. | 1562 руб. 04 коп. |
| 3 | д. Великие Бесяды, ул. Поселковая, 27 А, кадастровый номер 623288016101000094 | 0,2125 га | подъездные пути удовлетворительные | 3773 руб. 67 коп. | 754 руб. 73 коп. | 1315 руб. 65 коп. |

Задаток перечисляется на р/счет № 3600619171104 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 795, УНП 600181536, ОКПО 04431642, Янушковичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Аукцион состоится 15.06.2017 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 10. Заявление на участие и необходимые документы принимаются до 10.06.2017 г. (последний день подачи заявления 09.06.2017 г. до 17.00) по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 10.

**Контактные телефоны: (8 01774) 57 4 35, 57 4 99**

алімпіец
ЗВЯЗДА
выпуск №5 (54)
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь



PyeongChang 2018

# ПРЭЗІДЭНТ ПАДПІСАЎ ЗАЯЎКУ

## Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў удзел беларускай каманды ў XXIII зімовых Алімпійскіх гульнях

**Яны пройдуць з 9 па 25 лютага 2018 года ў карэйскім Пхенчхане, дзе будзе прадстаўлена сем відаў спорту, якія ўключаюць у сябе 15 зімовых спартыўных дысцыплін: тры канькобежныя (фігурнае катанне, канькабежны спорт і шорт-трэк), шэсць лыжных (гарналыжны спорт, лыжны спорт, фрыстайл, лыжнае дваябор'е, скачкі з трампліна і сноўборд), дзве бабслейныя: бабслей і скелетон; а таксама біятлон, кёрлінг, хакей і саначны спорт.**

Цяпер беларускія спартсмены змагаюцца за правы выступіць у такіх відах спорту, як біятлон, фрыстайл, лыжныя гонкі, канькабежны спорт, шорт-трэк і фігурнае катанне. Плануецца, што нашы атлеты змогуць заваяваць 25—30 ліцэнзій.

Нагадаем, што беларускія спартсмены ўдзельнічаюць у зімовых Алімпійскіх гульнях з 1964 года. Першы медаль у скарбонку каманды прынесла ў 1968 годзе ў Грэноблі ў лыжных гонках Рыта Ачкіна. Самастойнай зборнай беларускія спартсмены пачалі выступаць на Гульнях у Лілехамеры ў 1994 годзе, дзе былі заваяваны дзве сярэбраныя ўзнагароды. Усяго ў актыве беларускіх спартсменаў 19 медалёў, з іх сем залатых. У складзе суверэннай каманды з 1994 па 2014 год заваявана 15 медалёў: шэсць залатых, чатыры сярэбраныя і пяць бронзавых.

* * *

**Створаны аргкамітэт па падрыхтоўцы і ўдзеле беларускіх спартсменаў у зімовых Алімпійскіх гульнях — 2018 і зімовых Параалімпійскіх гульнях у Пхенчхане.**

Адпаведнае распараджэнне падпісаў прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй Кабякоў. Старшынёй аргкамітэта прызначаны намеснік прэм'ер-міністра Васіль Жарко.

Арганізацыйны камітэт пры неабходнасці ўпаўнаважаны прыцягваць да работы кіраўнікоў і спецыялістаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных ураду, а таксама аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама і іншых арганізацый ■

Сяргей ДАЛІДОВІЧ:

# «Куды больш прыемна быць спартсменам, чым трэнерам»

## Пра пенсію ў 44 гады і медаль Алімпійскіх гульняў, які можна выйграць ужо скончыўшы кар'еру

**У спорце ён ужо каля 30 гадоў, сёння Сяргей без сумнення самы вядомы лыжнік нашай краіны. У яго кар'еры было шэсць Алімпійскіх гульняў, але не было алімпійскіх медалёў. Усе гады, якія ён правёў у зборнай, Далідовіч быў у статусе лідара, а пасля Гульняў-2014 у Сочы стаў для сваіх калег трэнерам, але неўзабаве ўсё ж сам вярнуўся на лыжню. У гэтым сезоне пасля чэмпіянату свету спартсмен прыняў канчатковае рашэнне паставіць лыжы ў кут, але спорт пакідаць не спяшаецца. Пасля завяршэння кар'еры прайшоў усяго месяц, мы сустрэліся з Сяргеем, каб даведацца, як ён правёў гэты час, і пагаварыць пра далейшыя перспектывы лепшага лыжніка краіны.**

***— Сяргей, развітвацца са спортам балюча для любога спартсмена?***

— Так. Можа, мне троху лягчэй, таму што я плаўна да гэтага ішоў, хацеў заканчваць кар'еру яшчэ два гады таму, пасля Алімпіяды ў Сочы. Потым памяняліся некаторыя абставіны, і на год я яшчэ вырашыў застацца, але цяпер маё рашэнне канчатковае. Можна сказаць, два сезоны працаваў гуляючым трэнерам у мужчынскай камандзе, гэта быў бясцэнны вопыт, у якім мне штосьці спадабалася, штосьці не. Але калі б зараз прапанавалі такую ж ролю, я адмовіўся б, бо зразумеў: на двух крэслах усядзець немагчыма.

Цяпер прайшоў усяго месяц з таго моманту, як я перастаў трэніравацца, 1 красавіка яшчэ бег марафон. Але гэта, дарэчы, калі не лічыць маіх трохгадзінных шпацыраў з дзіцячай каляскай, калі малодшая дачка спіць. Мае трэніроўкі зараз, напэўна, выглядаюць менавіта так.

***— Назад не цягне?***

— Вясной, пасля цяжкага сезона мала ў каго ўзнікае жаданне вярнуцца да трэніровак, нават у дзеючых спартсменаў. Зараз у лыжнікаў яшчэ ідзе асэнсаванне вынікаў сезона. Але хутка, думаю, мяне пачне ламаць, арганізм за столькі гадоў прывык да сур'ёзных фізічных нагрузак.

***— Нават на інтэрв'ю вы прыйшлі з сям'ёй, цяпер больш часу ўдзяляеце родным?***

— Ды я наогул вельмі сямейны чалавек і заўсёды ім быў. У мяне тры дачкі, малодшая яшчэ зусім маленькая, мне цікава назіраць за яе сталеннем, як яна спазнае гэты свет, колькі адкрыццяў для яе на кожным кроку. З іншымі дзецьмі ў мяне такой магчымасці не было, спорт адбіраў вельмі шмат часу, таму што ў паўсілы я ніколі не працаваў.

***— Які перыяд вашай кар'еры запомніўся больш за ўсё?***

— Напэўна, першыя перамогі. Вядома, асобна стаіць вікторыя этапу Кубка свету ў 2001 годзе, з ёй не параўнаецца ні 5-е месца на Алімпіядзе ў Сочы, ні іншыя добрыя выступленні. Наогул за кар'еру ў мяне было 3 подыумы (подыум у лыжным спорце — гэта першыя 6 месцаў) чэмпіянату свету, гэта сур'ёзны ўзровень, але калі ты менавіта першы — гэта заўсёды іншае. Няважна — на чэмпіянаце рэспублікі ці свету.

***— Гады лічылі, колькі вы ўжо ў спорце?***

— У прафесійным, можна лічыць, што з 7-га класа, калі я пайшоў у спартыўны інтэрнат і пачаў рабіць свае першыя сур'ёзныя крокі, стаў трэніравацца разумна. Прыйшлі першыя поспехі, і тады я зразумеў, што магу паказваць годныя вынікі. У мой час не было меркантыльных інтарэсаў у спорце, як у цяперашняга пакалення. Калі заканчваў 10-ы клас, настаўніца папрасіла напісаць у запісках, чаго хацеў бы дамагчыся кожны з нас. Я напісаў, што хачу трапіць у зборную СССР і выканаць майстра спорту. У зборную Саюза трапіць не паспеў па часавых рамках, але калі б СССР пратрымаўся яшчэ хоць бы год, то ў юніёрскай камандзе быў бы дакладна.

***— Што напісалі б у такой запісцы цяпер?***

— Быў бы ўжо менш сціплы, пажадаў бы быць як мінімум прызёрам чэмпіянатаў свету і Алімпійскіх гульняў. Цяпер тыя нашы жаданні выглядаюць смешна, мне здаецца, сучасныя дзеці мараць месцы ўсё і адразу. І гэта, дарэчы, на мой погляд, вялікая праблема сёння. У нас былі зусім іншыя арыенціры, а цяпер па сваіх дзецях бачу, што ім нашмат цяжэй пераварваць інфармацыю і дамагацца чагосьці, вакол шмат спакус — гаджэты, інтэрнэт.

***— Але і ў ваш час былі спакусы, можа, крыху іншыя...***

— Так, усе парушалі рэжым, тут няма чаго хаваць. І зараз, і тады. Але калі б я моцна захапляўся гэтымі парушэннямі, то столькі гадоў не бегаў бы. Спакусы, кампаніі існавалі заўсёды, але мяне гэта неяк абмінула. У 7-м класе я, дзякуй Богу, з'ехаў з роднага горада — Оршы, тады там была вельмі напружаная крымінагенная абстаноўка. Многія мае сябры адтуль ужо скончылі сваё зямное жыццё.

***— За вашымі плячыма шэсць Алімпіяд, якая з іх стала асаблівай?***

— Асабняком, напэўна, стаяць першая і апошняя. У Нагана ў 1998-м мне было 25, а ў Сочы ў 2014-м — 40, таму гэта дзве розныя рэчы, немагчыма нават параўноўваць. Першыя Гульні — гэта адкрыццё, а ўсе астатнія — толькі параўнанне. Усё маё жыццё мералася алімпійскімі цыкламі, нягледзячы на гэта, яно было вельмі яркім, усе моманты памятаю, яны непаўторныя. Напэўна, буду настальгаваць.

***— На Алімпіядзе ў Сочы, дзе вы сталі пятым, наперадзе аказаліся расіяне Лягкоў і Выглежанін, якія цяпер падазраюцца ва ўжыванні допінгу. Гэта значыць, магчыма, яны скралі ў вас алімпійскі медаль?***

— У мяне наогул няма ніякіх думак з гэтай нагоды. За хлопцаў крыўдна. Пакуль па іх пытанні не вынеслі ніякіх рашэнняў, да канца 2017 года, можа, паўстане яснасць. Штосьці зменіцца ў маім жыцці, калі я атрымаю алімпійскі медаль? Вядома, не. Адна справа, калі ты атрымліваеш узнагароду адразу пасля гонкі і разумееш, што на алімпійскім п'едэстале, а іншая, калі прайшло ўжо 4 гады. Я заўсёды імкнуўся быць першым, пераможцам, аказацца на п'едэстале і лічу, што годна прадстаўляў сваю краіну шмат гадоў. Сказаць, што вось гэты медаль можа змяніць гісторыю маёй кар'еры ў такім узросце, пры такой колькасці гонак — не.

***— Спартсмен можа хутка стаць любімчыкам публікі і адным правалам так жа хутка трапіць у няласку, з вамі такое было?***

— Шмат хто праходзіць праз выпрабаванне славай, але ў мяне ж, як такой, і не было. Нават пасля перамогі на Кубку свету 16 гадоў таму. Тады гэта ўспрынялі неяк спакойна, можа, гэта было настолькі нечакана, што прайшло міма прэсы і балельшчыкаў. Цяпер, напэўна, было б зусім па-іншаму.

Практычна пасля кожнай гонкі ў сеціве з'яўляліся каментарыі, і я зараз схлусіў бы, калі б сказаў, што не чытаю форумы. Але ўспрымаць усё, што там пішуць, за чыстую манету таксама нельга. Выдатна разумею, што немагчыма добра бегаць заўсёды, выступаць зусім дрэнна — сорамна. Прыязджаць і займаць апошнія месцы — дрэнна. Але, напрыклад, бегаць на чэмпіянаце свету ці Кубку свету і трапляць у 30-ку, лічу, гэта нармальны сярэдні вынік.

***— Вы ўжо атрымалі невялікі вопыт трэнерскай работы. Цяпер можаце параўнаць, што складаней — быць спартсменам ці трэнерам?***

— Уся справа ў меры адказнасці. Трэнеру нашмат складаней, я вельмі моцна перажываў, калі працаваў настаўнікам, без перабольшання, кожную раніцу ўставаў і думаў, што неабходна зрабіць, каб палепшыць вынікі хлопцаў. Кожную трэніроўку, кожны дзень прапускаецца праз сябе, і, калі бачыш, што нешта не атрымліваецца, вельмі цяжка. Калі ў гэтым сезоне аднавіў кар'еру спартсмена, у мяне застаўся толькі адзін выхаванец, стала нашмат прасцей. Куды больш прыемна быць спартсменам, чым трэнерам.

***— На ваш погляд, якой галоўнай якасцю павінен валодаць настаўнік?***

— Самае важнае — гэта быць на адной хвалі са сваім выхаванцам, не трэба сябраваць, не трэба панібрацкіх адносін, павінны быць агульная мэта і адна хваля.

***— Дочкі пайшлі па вашых слядах...***

— І я не працівіўся гэтаму. Старэйшая ў нас спачатку займалася канькамі, сярэдняя — бадмінтонам, але абедзве ўсё роўна прыйшлі да лыжнага спорту. Раней яны наогул не ўспрымалі мяне як трэнера, а зараз старэйшая стала прасіць аб дапамозе, ужо прымаюць нейкія парады, прыслухоўваюцца да падказак.

***— Вернемся да пачатку нашай размовы, вы скончылі спартыўную кар'еру, што далей?***

— У мяне толькі адзін варыянт — спорт. Што я магу рабіць яшчэ, дзе быць карысны? Мне здаецца, толькі трэніраваць, а ці запросяць мяне на гэтую работу, пакуль невядома, усё вырашыцца літаральна на днях. Калі трэнерам не паклічуць, буду трэніраваць дачок, ды і пенсію я сабе ўжо зарабіў — 27 гадоў стажу. Яна, напэўна, невялікая, як і ва ўсіх людзей, але пенсіянеры ж неяк жывуць, чаму я не змагу?

***— Праз тыдзень вам 44, не страшна ў гэтым узросце ўжо адчуваць сябе пенсіянерам?***

— Мяне ўжо даўно ім завуць, але на апошнім чэмпіянаце свету пенсіянер абыграў усіх сваіх малодшых таварышаў па камандзе і многіх замежных спартсменаў. Я ўжо спакойна да гэтага стаўлюся. Раней, калі называлі ветэранам, мяне гэта крыху закранала, таму што першая асацыяцыя была з ветэранамі вайны. Мы ж выраслі на вялікай перамозе, два мае дзяды прайшлі вайну, вось яны ветэраны, а я проста доўгажыхар у спорце ■

### ❍ БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА

**Сяргей Далідовіч нарадзіўся 18 мая 1973 года ў Оршы. У Кубку свету дэбютаваў у 1993 годзе, у сакавіку 2001-га атрымаў сваю першую і адзіную перамогу на этапе Кубка свету. Лепшым дасягненнем у агульным выніковым заліку з'яўляецца 31-е месца ў сезоне 2000/01.**

**За сваю кар'еру прымаў удзел у 6 Алімпіядах (1994—2014) і 12 запар чэмпіянатах свету (1995—2017). Лепшы вынік на Гульнях паказаў у 2014 годзе ў Сочы — 5-е месца ў масстарце на 50 км. На чэмпіянатах свету выходзіў на старт у 34 дысцыплінах. Лепшы вынік — 4-е месца ў скіятлоне на 30 км на чэмпіянаце свету 2011 года.**





Татавы дочкі: Вольга, Дар'я і зусім маленькая Злата.

■ Чулі?!

# Скараціць хакейную эліту?

**Прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі хакея Рэнэ Фазель падчас чэмпіянату свету ў Францыі і Германіі агучыў ідэю скарачэння вышэйшага дывізіёна да 12 каманд. «Я вялікі прыхільнік гэтай ідэі, яна зрабіла б турнір узрушальна цікавым. Гэта ідэальны варыянт», — заявіў Фазель.**



Праўда, ён адзначыў, што палітычна ўвасобіць гэтую ідэю ў жыццё будзе неймаверна складана. «Пашырыць колькасць камандаў будзе ў шмат разоў прасцей, чым скараціць, хоць пашырэнне мы і не разглядаем. А вось скарачэнне многае спросціць, знізіць выдаткі. Будзе не 10 матчаў, а максімум — 8. Па пяць у групе, далей — плэй-оф. Узровень у цэлым будзе вышэйшы, што можа справакаваць большы інтарэс».

Прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі адзначыў, што калі зрабіць два дывізіёны па 12 камандаў, гэта магло б нават прынесці больш карысці і зрабіць абодва турніры вельмі прывабнымі. «З іншага боку, пры 16 удзельніках ёсць свае плюсы. Скажам, Паўднёвая Карэя выбілася цяпер у элітны дывізіён, а пры фармаце з 12 камандамі гэта было б амаль немагчыма. Трэба разгледзець усе плюсы і мінусы, вывучыць вопыт пяці апошніх гадоў. Калі можна штосьці палепшыць — трэба паляпшаць. Іншая справа, што ёсць яшчэ пытанне маркетынгу. Наш партнёр у гэтай галіне выступае за 16 удзельнікаў, паколькі хоча прадаваць тэлеправы ў як мага большую колькасць краін», — дадаў Рэнэ Фазель ■

# ПЯЦЬ ЖЫЦЦЯЎ СТАДЫЁНА «ДЫНАМА»

## Нараджэнне

У 30-я гады ў маладой савецкай краіне паўсюдна ўзводзіліся спартыўныя збудаванні, ініцыятыва будаўніцтва стадыёна «Дынама» зыходзіла ад кіраўніцтва Аб'яднанага галоўнага палітычнага ўпраўлення. Было вырашана, што новы спартыўны аб'ект павінен з'явіцца ў цэнтры горада, недалёка ад вакзала на месцы былых найстарэйшых яўрэйскіх могілак, закрытых яшчэ ў 1883 годзе. Газета «Минское слово» пісала: *«У пачатку XX стагоддзя па тэрыторыі сучаснага стадыёна праходзіла вуліца Магазінная і знаходзіліся старыя яўрэйскія могілкі, якія служылі выдатным схованкам для рознага роду хуліганаў»*.

Будавалі стадыён, што называецца, усёй грамадой: на будоўлі быў задзейнічаны кожны дынамавец, а гэта — і памежнікі, і асабісты склад НКУС. Кожны павінен быў адпрацаваць на «Дынама» не менш за 100 гадзін.

Тады першы варыянт стадыёна быў пабудаваны з дрэва, галоўная трыбуна размяшчалася на месцы аркі па вуліцы Кірава, а футбольнае поле — на месцы, дзе праз многія дзесяцігоддзі разгарнуўся рэчавы рынак. Урачыстае адкрыццё стадыёна адбылося 12 чэрвеня 1934 года.



Стадыён «Дынама», 1934 г.

«Дынама» хутка стаў самым наведвальным спартыўным аб'ектам Мінска, а можа, і ўсёй вялікай краіны. Таму ўжо праз тры гады пасля адкрыцця ўзнікла патрэба ў павелічэнні яго ўмяшчальнасці. На працягу 1937—1939 гадоў была праведзена першая рэканструкцыя стадыёна, у яе выніку ўмяшчальнасць аб'екта павялічылася на 12 тысяч месцаў.

## Складаны час

У гады Вялікай Айчыннай вайны стадыён быў разбураны. *«24 і 25 чэрвеня 1941 года варожыя эскадрыллі падчас налёту фугаснымі і запальнымі бомбамі падпалілі стадыён. А таксама склады магазіна спартыўнага таварыства «Дынама». Падчас пажару ўсе матэрыяльныя каштоўнасці былі цалкам знішчаны. Нанесены ўрон на 70 000 савецкіх рублёў»*, — кажуць архіўныя запісы.

У тым, што пасля бяды стадыён трэба адраджаць, не было ніякіх сумненняў, новы спартыўны комплекс пачалі будаваць з разбору завалаў у 1947 годзе, аб'ект будаваўся па праекце архітэктараў М. Колі і М. Паруснікава. Імі была распрацавана новая планіроўка, згодна з якой цэнтральную трыбуну размясцілі на натуральным схіле, а спартыўнае поле ў нізіне, недалёка ад рэчышча Свіслачы. Рана ці позна гэты пралік павінен быў згуляць злы жарт, і гэта адбылося ў канцы 1950-х. На адным з матчаў падчас гульні праваліўся кавалак поля, сустрэча была спынена, а каб адрамантаваць абвал, спатрэбілася некалькі машын пяску і новы дзёрн.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Першы футбольны матч на не да канца адноўленым пасля вайны «Дынама» прайшоў ужо 12 чэрвеня 1948 года, але будаўнічыя работы цалкам завяршыліся толькі ў 1954-м.

«Дынама» зноў вярнуў сабе званне самага цікавага месца ў Мінску. На стадыёне, акрамя спартыўных, праводзіліся і грамадска-палітычныя мерапрыемствы, для навучэнцаў найбліжэйшых да стадыёна школ на ім праходзілі ўрокі фізкультуры. Каля стадыёна з'явіўся сквер, алеі вакол яго ўпрыгожвалі скульптуры на спартыўныя тэмы. А па вечарах да стадыёна сцягвалася ўся прасунутая моладзь таго часу, таму што на «Дынама» існавала сучасная танцавальная веранда. Яна ўяўляла сабой квадратную, выкладзеную светлай пліткай, пляцоўку. Днём тут трэніраваліся баксёры, а ўвечары былі танцы для моладзі горада.

Узімку на «Дынама» заліваліся ўсе пешаходныя дарожкі і пляцоўка каля галоўнага ўвахода. Для спартсменаў рыхтаваліся бегавыя лядовыя дарожкі вакол стадыёна, а па вечарах пад музыку там можна было добра правесці час на каньках.

*«Вось тут, сярод разрухі, нястачы, убоства мінскіх пасляваенных гадоў, і кінулася ў вочы ўсё гэта незвычайнае, каляровае: футбол і стадыёны, гульцы мясцовыя і чужыя, з невядомых краёў, велізарныя навалы людзей і конная міліцыя, гудзіць Вавілон трыбун»*, — успамінае пра той час пісьменнік Аляксандр Станюта.

## Новае дыханне

У 1978—1980-х гадах напярэдадні XX алімпійскіх гульняў у Маскве стадыён зноў прайшоў праз значную рэканструкцыю. Аб'ект рыхтаваўся прыняць матчы алімпійскага футбольнага турніру. Тэрыторыя стадыёна была пашырана і абгароджана новым плотам з сімволікай Алімпіяды-80. Замест ранейшай, старой, была пабудавана сучасная цэнтральная трыбуна, устаноўлены новыя асвятляльныя мачты з магутнымі пражэктарамі. З Венгрыі прывезлі новае футбольнае табло, а таксама збудавалі факельную чашу для алімпійскага агню. Газон поля да адказнага выпрабавання рыхтавалі на працягу аж двух гадоў.

«Дынама» перабудавалі з разлікам на 50 тысяч гледачоў, над заходняй трыбунай з'явіўся казырок — другі ярус месцаў для гледачоў. На самім стадыёне прадугледзелі памяшканні і ложу для прэсы, тэлебачання, каментатарскія кабіны, памяшканне для допінг-кантролю, бар і кабіны для міжнароднай тэлефоннай сувязі.

Падчас будаўніцтва інжынер праекта трыбуны-казырка эміграваў у Ізраіль, а па горадзе пайшла чутка, што пры поўнай загружанасці казырок можа зваліцца на заходні сектар. Аднойчы ноччу па трывозе паднялі каля 12 тысяч курсантаў і салдат, каб выпрабаваць устойлівасць збудавання, пасля выпрабаванняў канструкцыю ўдасканалілі. Аднак трыбуна-казырок так і не стала ідэальнай — падчас дажджу залівала ложу, а зімой там абледзянелі прыступкі. Дарэчы, толькі ў канцы 1990-х казырок перасталі выкарыстоўваць, а лаўкі на трыбунах стадыёна замянілі на пластыкавыя сядзенні, праз гэта ўмяшчальнасць стадыёна зноў упала да 35 тысяч.



Рэпрадукцыя з паштоўкі 1983 г.

Зноў жа не ідэальным аказалася і футбольнае поле стадыёна, за тыдзень да афіцыйнай цырымоніі адкрыцця алімпійскага турніру яма ўтварылася на тым месцы, дзе 400 фізкультурнікаў павінны былі паказваць «беларускую піраміду». Непаладкі аператыўна ліквідавалі, і ў выніку ў другой палове ліпеня 1980 года стадыён «Дынама» прыняў 7 матчаў алімпійскага футбольнага турніру, у тым ліку і 1 чвэрцьфінал.

## Ліхія 90-я

У першае дзесяцігоддзе існавання маладой незалежнай Беларусі на стадыёне пачалі праводзіць не толькі спартыўныя мерапрыемствы, але і шоу-праграмы. Там выступалі самыя папулярныя артысты таго часу — Ала Пугачова, «Ласкавы май», Ігар Талькоў, Юрый Шаўчук і іншыя. Дарэчы, у 1989 годзе Ала Пугачова ўстанавіла фенаменальны рэкорд наведвальнасці канцэртаў на мінскім стадыёне «Дынама», яна дала восем «сольнікаў» і ўсё — з аншлагам (гэта прыкладна 400 тысяч гледачоў).

У сярэдзіне 90-х на прылеглай да стадыёна тэрыторыі з'явіўся рэчавы рынак, які стаў адным з самых папулярных у сталіцы. У пачатку новага тысячагоддзя, у 2012-м, ён быў закрыты.

Што датычыцца спартыўнага складальніка, то да 2009 года на стадыёне свае дамашнія матчы праводзіла мінскае «Дынама». А ў сезонах 2008/09, 2011/12 і 2012/13 барысаўскі БАТЭ выкарыстоўваў стадыён у якасці дамашняй арэны на гульні групавога этапу Лігі чэмпіёнаў. Так, на «Дынама» згулялі знакамітыя еўрапейскія клубы — «Ювентус», «Рэал», «Зеніт» і інш. Неадназова стадыён станавіўся родным домам і для нацыянальнай футбольнай зборнай.



Ігар Талькоў падчас канцэрта на стадыёне «Дынама». Красавік 1991 г.

## Прайшла футбольная эра?

Сёння «Дынама» не падобны ні на адзін варыянт, апісаны раней. Гэта адна вялікая будоўля. Гаворка аб яго маштабнай рэканструкцыі ішла некалькі гадоў, разглядаліся розныя варыянты статусу арэны — выключна футбольная, лёгкаатлетычная, шматфункцыянальная. Пазней некалькі разоў мяняўся і праект рэканструкцыі, і варыянты супрацоўніцтва з рознымі замежнымі будаўнічымі кампаніямі.

Цяпер рэканструкцыя «Дынама» выконваецца ў адпаведнасці з указам ад 16 мая 2014 года. Дакументам прадугледжваецца перапрафіляванне стадыёна ў лёгкаатлетычны з захаваннем магчымасці праводзіць футбольных матчаў.

Намеснік начальніка па вытворчасці будупраўлення №94 ААТ «Будтрэст №1» Дзяніс Повад адзначаў, што самыя складаныя этапы рэканструкцыі ўжо пройдзены. «Па трыбунах маналітныя работы завершаны цалкам. Засталося зманціраваць навес, усталяваць сядзенні, выканаць аддзелку ўнутраных памяшканняў заходняй трыбуны, зманціраваць шкленне. З сярэдзіны мая прыступім да мантажу вентфасадаў. У мінулым годзе да наступлення халадоў паспелі падрыхтаваць дрэнаж асноўнага і размінкавага палёў. Улетку зоймемся кладкай сістэмы падагрэву поля, газона і бегавых дарожак», — адзначыў ён.

Плануецца, што на тэрыторыі стадыёна абсталююць гульнявыя зоны, цір, скаладром, рэлаксацыйныя і аздараўленчыя цэнтры, віп-боксы, паркінг. Лёгкі, але трывалы алюмініевы дах створыць навес, пад якім будзе знаходзіцца каля 70% месцаў для гледачоў. Усяго стадыён змесціць каля 22 тысяч чалавек.

Немалаважна, што пры рэканструкцыі па-ранейшаму будзе захоўвацца гістарычная частка стадыёна, у тым ліку аркада з боку вуліцы Кірава. Плануецца, што «Дынама» адкрыецца ў снежні 2017-га, а ўжо ў 2019 годзе на ім пройдуць цырымоніі адкрыцця і закрыцця II Еўрапейскіх гульняў.

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. lobazhevich@zviazda.by

## УПРАВЛЯЮЩИЙ ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Торги проводятся в форме открытого аукциона. **Торги состоятся 15 июня 2017 года в 11.00 по адресу: Гомельская область, г. Ветка, ул. Батракова, 38**

| № лота | Наименование объекта, краткая характеристика объекта (Лота) | Начальная цена продажи, руб. (цена с учетом НДС) | Задаток, руб. | Шаг аукциона, % | Затраты на подготовку документации |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот №67 | Установка компрессорная ВК20Е-8-500Д, инв. №985 | 7 080,00 | 708,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №68 | Плата КХ-ТЕ82461, инв. №983 (мини АТС) | 1 140,00 | 114,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №69 | Сварочный аппарат ГДМ-317 У-2, инв. №857 | 720,00 | 72,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №70 | Сварочный преобразователь ПСО-300-3, инв. №320 | 720,00 | 72,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №71 | Компрессор Atlas Copco AIR GA18P, инв. №8 | 5 484,00 | 548,40 | 5 | 33,25 |
| Лот №72 | Кондиционер EACS 18 HS EU, инв. №2015 | 360,00 | 36,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №73 | Кондиционер EACS 07 HS EU сплит инв. №2018 | 240,00 | 24,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №74 | Кондиционер лапицкая, инв. №56 | 360,00 | 36,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №75 | Шкаф ГМ 1366, инв. №77 | 480,00 | 48,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №76 | Шкаф д/одежды ГМ1368, инв. №78 | 480,00 | 48,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №77 | Шкаф для документов ГМ 1366, инв. №91 | 480,00 | 48,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №78 | Шкаф для одежды ГМ 1368, инв. №93 | 480,00 | 48,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №79 | Шкаф для одежды ГМ 4724, инв. №92 | 432,00 | 43,20 | 5 | 33,25 |
| Лот №80 | Холодильник Мх-2823-80, инв. №79 | 312,00 | 31,20 | 5 | 33,25 |
| Лот №81 | Аппарат сушильный АСТ-73, инв. №863 | 93,60 | 9,36 | 5 | 33,25 |
| Лот №82 | Автомат съемки эласт. покрыт. АСЭП-2, инв. №361 | 1 560,00 | 156,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №83 | Пресс АРО-1, инв. №753 | 3 480,00 | 348,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №84 | Пресс для угаров ПУ-1, инв. №752 | 2 520,00 | 252,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №85 | Смеситель для угаров СН-3-У, инв. №750 | 3 480,00 | 348,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №86 | Станок для шлифовки валиков СШВ-1, инв. №335 | 1 200,00 | 120,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №87 | Станок для шлифовки эластики СПЭ-4, инв. №332 | 1 128,00 | 112,80 | 5 | 33,25 |
| Лот №88 | Станок для подшл. эласт. покрытий СШВ-2, инв. №846 | 936,00 | 93,60 | 5 | 33,25 |
| Лот №89 | Щипальная машина СЩ-850, инв. №754 | 744,00 | 74,40 | 5 | 33,25 |
| Лот №90 | Гидравлический литьевой пресс, инв. №922 | 2 640,00 | 264,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №91 | Грузонесущий цепной конвейер ЦПК-80Р, инв. №840 | 6 840,00 | 684,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №92 | Шлифовальная машина СО-111-43, инв. №321 | 1 680,00 | 168,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №93 | Транспортер для погр. пряжи собств. изг., инв. №316 | 2 040,00 | 204,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №94 | Площадка передвижная (транспорт. лента), инв. №903 | 2 040,00 | 204,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №95 | Шлифовальная машина, инв. №54 | 37 920,00 | 3 792,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №96 | Телевизионная система видеонаблюдения, инв. №88 | 30 360,00 | 3 036,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №97 | Преобразовательная установка «Уза», инв. №706 | 600,00 | 60,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №98 | Мотальная машина МТ-2, инв. №87 | 4 020,00 | 402,00 | 5 | 33,25 |
| Лот №99 | Мотальная машина МТ-2, инв. №86 | 3 144,00 | 314,40 | 5 | 33,25 |
| Лот №100 | Погрузчик вил. элект. KOMATSU FB15-15, инв. №1110 | 3 480,00 | 348,00 | 5 | 33,30 |
| Лот №101 | Автопогрузчик ДВ-1788-33-20 МРБ (склад), инв. №588 | 4 800,00 | 480,00 | 5 | 33,30 |
| Лот №102 | Электропогрузчик, инв. №312 | 1 560,00 | 156,00 | 5 | 33,30 |

Имущество расположено по адресу : Гомельская область, г. Ветка, ул. Батракова, 38.

Для участия в торгах необходимо:

1. Оплатить задаток в размере, указанном в объявлении от начальной цены Лота на р/с 3012210290015 в РКЦ №8 филиала ОАО «Белагропромбанк» Гомельское областное управление г. Ветка, ул. Чапаева, 6, МФО 151501912, УНН 400052674 .

2. **По 12 июня 2017 года** включительно в рабочие дни с 9.00 до 15.00 подать заявление на участие в торгах и другие документы в соответствии с законодательством по адресу: Гомельская обл., г. Ветка, ул. Батракова, 38.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении(информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателям – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельство о государственной регистрации; юридическим лицам – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо предоставляет его руководитель), а также копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельство о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организации; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документы о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный и обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организации без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя-доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

В случае если аукцион признан не состоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Не явка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона, заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона, оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроков их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Порядок проведения торгов, условия, оформление участия в торгах в определяется согласно Плана ликвидации ОАО «Ветковская хлопкопрядильная фабрика», ознакомится с которым можно в дни приема заявок на участие в торгах. С дополнительной информацией о торгах можно ознакомится по адресу: Гомельская область, г. Ветка, ул. Батракова, 38, тел. 8(02330) 2-11-06, 2-12-03.

**г. ЧАШНИКИ** **13.06.2017**

УНП 300016158

## ИЗВЕЩЕНИЕ

### ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ НЕЗАСЕЛЕННОГО ЖИЛОГО ДОМА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ОАО «ПРОЗЕМЛЕ-АГРО», ЧАШНИКСКОГО РАЙОНА ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена предмета аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Незаселенный жилой дом, расположенный по адресу: Витебская область, Чашникский район, Проземлянский с/с, д. Зазерица, 1 | Характеристика недвижимости: – **капитальное строение с инвентарным номером 235/С-8906** (здание одноквартирного жилого дома) с верандой, террасой, двумя сараями, уборной – одноэтажное сборнощитовое, обложенное кирпичом, 1986 г. постройки, общей площадью 61,9 кв. м, фундамент – бетонный, перекрытия деревянные, крыша шиферная. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 225184105601000032 для обслуживания одноквартирного жилого дома, площадью 0,25 га. Ограничения в пользовании земельным участком в связи с его расположением: в водоохранных зонах и прибрежных полосах рек, площадь 0,25 га. Право на земельный участок – право аренды. | 10 180, 28 | 509, 01 |

**ОРГАНИЗАТОР** – ОАО «Проземле-Агро», 211149, Витебская обл., Чашникский р-н, аг. Проземле, ул. Центральная, 7, тел.: (02133) 6-30-62, 6-30-64, e-mail: andrej0915@mail.ru.

**ПРОДАВЕЦ** – Открытое акционерное общество «Проземле-Агро», тел. 8 (02133) 6-30-62.

**Условие продажи недвижимости –** возмещение покупателем затрат, связанных с подготовкой правоустанавливающих документов для проведения аукциона, в размере: **по Лоту № 1** – 1 322, 51 (одна тысяча триста двадцать два) рубля 51 копейка; возмещение покупателем затрат, связанных с проведением аукциона.

**Аукцион состоится 13 июня 2017 г. в 11.00 в здании администрации ОАО «Проземле-Агро» по адресу: 211149, Витебская обл., Чашникский р-н, аг. Проземле, ул. Центральная, 7.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь, в том числе постоянно проживающие за ее пределами, но имеющие право на приобретение жилых помещений в соответствии с международными договорами Республики Беларусь. Участнику необходимо подать заявление.

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: **граждане Республики Беларусь** – копию документа, удостоверяющего личность; **представители граждан** – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность.

**Сумма задатка вносится до подачи заявления на участие в аукционе наличными денежными средствами в кассу продавца.**

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00, **последний день приема документов 09.06.2017 до 15.00** по адресу: 211149, Витебская обл., Чашникский р-н, аг. Проземле, ул. Центральная, 7. Заключительная регистрация участников 13.06.2017 с 10.00 до 11.00. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи незаселенных жилых помещений, находящихся в собственности ОАО «Проземле-Агро», на аукционе, утвержденным Внеочередным общим собранием акционеров ОАО «Проземле-Агро» (протокол №2 от 22.07.2016 года). Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

